Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
18 ЧЭРВЕНЯ 2024 г.
АЎТОРАК
№ 117 (30251)



ЗМЯНЕННІ Ў САЦЫЯЛЬНЫХ ВЫПЛАТАХ 4



ЯК ПЕРААДОЛЕЦЬ ЭМАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫГАРАННЕ? 8

З першых вуснаў

## «ЭКАНОМІКА ПАКУЛЬ СКЛАДВАЕЦЦА, ХОЦЬ ЁСЦЬ ФАКТАРЫ, ЯКІЯ НАСЦЯРОЖВАЮЦЬ»

### Аб чым прэм'ер-міністр дакладваў Прэзідэнту



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка часта паўтарае, што эканоміка — аснова ўсяго. Таму гэтай тэме заўжды пільная ўвага. Новы рабочы тыдзень кіраўнік дзяржавы пачаў з даклада прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі, прысвечанага менавіта эканоміцы. І, як заўсёды арыентуе кіраўнік дзяржавы, на першым плане не дасягненні, а праблемы.**

«Як мне дакладваюць, эканоміка сёлета пакуль складваецца, хоць ёсць, як заўсёды, пэўныя фактары, якія насцярожваюць. Хацелася б, каб мы найперш звярнулі на гэта ўвагу, — сказаў Прэзідэнт. — Але самае галоўнае (я заўважыў гэта і ў сродках масавай інфармацыі рознага ўзроўню) тое, што ў нас адмоўнае сальда. Хоць невялікае, але складваецца адмоўнае сальда ў знешнім гандлі. Я так разумею, што ў Мінэканомікі і ва ўрадзе павінны былі звярнуць на гэта ўвагу і прааналізаваць, у чым тут прычына».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як складваецца сітуацыя з плацяжамі на самым высокім узроўні, дэбіторскай, крэдыторскай запазычанасцю. Спытаў кіраўнік дзяржавы, як ідзе работа ў плане сэрвіснага абслугоўвання нашай тэхнікі. «Мы дамаўляліся аб тым, што трэба ствараць адзіныя цэнтры па абслугоўванні ўсёй беларускай тэхнікі і вызначыцца, у якіх пунктах, дапусцім, Кітайскай Народнай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі і гэтак далей», — сказаў ён. Звярнуў увагу Прэзідэнт і на пратэрмінаваныя запазычанасці, недахопы ў будаўніцтве жылля, кадравыя пытанні ды іншыя праблемы.

Асобны акцэнт Аляксандр Лукашэнка зрабіў на сельскую гаспадарку, дзе, па яго словах, сёння трэба мабілізавацца. «Надвор'е пакуль добрае стаіць і мы чакаем нядрэнны ўраджай. Няхай там будуць лішкі збожжа і іншага, але гэта ж ніколі не перашкодзіць, гэта наш золатавалютны запас», — адзначыў ён.

Раман Галоўчанка далажыў аб рабоце эканомікі за пяць месяцаў бягучага года. Ён адзначыў, што ўжо бачныя вынікі першага паўгоддзя і ў прынцыпе праглядаюцца вынікі года. «Калі гаварыць пра вынікі работы пяці месяцаў, то з асноўных пяці паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця поўнасцю выкананы і перавыкананы чатыры. Гэта: валавы ўнутраны прадукт склаўся на ўзроўні 105,2 працэнта, інвестыцыі — на ўзроўні 109,6 працэнта, рэальныя даходы насельніцтва — 109,8 працэнта, індэкс спажывецкіх цэн у межах прагнозу з пачатку года — 2,8 працэнта. Пяты паказчык недавыкананы, гэта экспарт, ён вышэйшы за ўзровень мінулага года — 102,1 працэнта, але крыху не дацягнулі да плана да 104 працэнтаў. Пры гэтым рост забяспечаны пераважна за кошт павелічэння фізічных аб'ёмаў экспарту на 8,7 працэнта. Экспартныя цэны на беларускую прадукцыю пакуль складваюцца крыху ніжэйшыя», — далажыў прэм'ер-міністр.

СТАР. 2

## «Касмічныя» чарэшні



Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ і Алег НАВІЦКІ сустрэліся зноў не ў космасе — на роднай беларускай зямлі. Касманаўты наведалі экскурсійна-турыстычны комплекс «Аптэкарскі сад» у Нацыянальным парку «Нарачанскі». Там ёсць своеасаблівая алея, дзе пладовыя дрэвы высаджваюць знакамітыя госці. Гэтым разам у садзе з'явіліся два новыя дрэўцы чарэшні — Марына пасадзіла саджанец сорту «Бурштынавая», а Алег — «Вугольчык». Дарэчы, Алег Навіцкі пяць гадоў назад пасадзіў тут яблыню і з радасцю засведчыў, што на маладым дрэўцы ўжо шмат яблыкаў. «Мы шчаслівыя людзі, што нарадзіліся ў гэтым багатым цудоўным краі», — сказаў ён. А Марына Васілеўская дадала, што для яе апынуцца ў такім выдатным месцы — найлепшая рэабілітацыя пасля палёту.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Безумоўна, прадугледжана этапнасць павышэння заработнай платы. Першы этап мы ўжо прайшлі. З 1 студзеня гэтага года павялічана базавая стаўка на 6,4 працэнта — з 235 рублёў да 250. Акрамя таго, у пачатку года ва ўсіх галінах бюджэтнай сферы рэалізавана павелічэнне стымуляцыйных выплат. На такія выплаты ў бюджэце прадугледжана больш як 1,6 мільярда рублёў. Цяпер мы працуем над другім павышэннем, і ў другім паўгоддзі, вядома, гэты этап рэалізуецца. Плануецца павышэнне і базавай стаўкі. Што датычыцца пенсіі, то сумесна з Міністэрствам фінансаў робім фінансавыя эканамічныя разлікі і вызначаем магчымасць другога этапу павышэння ў гэтым годзе. У выніку толькі першага павышэння за пяць месяцаў гэтага года памер пенсіі павялічыўся на 117,6 працэнта ў намінальным выяўленні».*

Форум магчымасцяў

## На гасціннай Віцебскай зямлі



**Праз 10 дзён Віцебшчына прыме гасцей і ўдзельнікаў XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Упершыню за 11-гадовую гісторыю форум пройдзе на пляцоўках адразу трох беларускіх гарадоў — Віцебска, Полацка і Наваполацка. Аб падрыхтоўцы, планах і настроі на мерапрыемства міжнароднага ўзроўню расказаў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

***— Аляксандр Міхайлавіч, сёлета паўночны рэгіён стане пляцоўкай для правядзення XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Што значыць гэта міжнародная падзея для Віцебшчыны?***

— Віцебская вобласць — адзін з тых рэгіёнаў, які славіцца мерапрыемствамі міжнароднага ўзроўню. Я маю на ўвазе такія знакамітыя фестывалі, як «Браслаўскія зарніцы», «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне, «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, «Вішнёвы фестываль» у Глыбокім. І, вядома ж, наш нацыянальны брэнд — Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Стаў традыцыйным і Міжнародны эканамічны форум «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы».

СТАР. 2

І мы там былі

## І ЗНОЎ ЗАКРУЖЫЦЬ ФЕСТЫВАЛЬ...

**Яркімі фарбамі і самабытнай музыкай напоўніў горад XXIII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2024». У святочную атмасферу жыхары і госці горада паглыбіліся ўжо з 11 чэрвеня. Асноўныя ж мерапрыемствы прайшлі 14—15 чэрвеня. Чым жа здзіўляў «Маладзечна-2024»?**



Фота БелТА.

### Музычны калейдаскоп

З мінулага года ў рамках фестывалю апрабавалі новы фармат правядзення другога і трэцяга тураў рэспубліканскага этапу Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Усе яны праходзяць на другі дзень для таго, каб удзельнікі таксама мелі магчымасць напоўніцу акунуцца ў атмасферу фестывалю.

Усяго ў конкурсе прыняў удзел 21 вакаліст: па тры прадстаўнікі ад кожнай вобласці і горада Мінска. Найлепшым вакалістам стала прадстаўніца Мінскай вобласці Вераніка Высоцкая. Менавіта ёй дасталіся Гран-пры і спецыяльны прыз Уладзіміра Мулявіна — хрустальная гітара.

Парадаваў фестываль сёлета і добрымі канцэртамі. Так, 14 чэрвеня ў Палацы культуры прайшла творчая вечарына арт-групы «Беларусы». Напярэдадні ж была творчая сустрэча з кіраўніком калектыву, заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь Валерыем Шматам у рамках праекта «Асоба эпохі».

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### 70 працэнтаў жыхароў Германіі не задаволены работай цяперашняга ўрада



Большая частка грамадзян ФРГ незадаволена дзеяннямі кіруючай у Германіі кааліцыі «Святлафор» (Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі, «зялёныя», Свабодная дэмакратычная партыя). Такую выснову можна зрабіць, зыходзячы з вынікаў апытання, якое было праведзена сацыялагічным інстытутам INSA па замове выдання Bild am Sonntag. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Вынікі апытання паказалі, што работай урада не задаволены 70 працэнтаў немцаў. Процілеглы пункт гледжання выказалі толькі 22 працэнты рэспандэнтаў. Прычым 62 працэнты не задаволены дзеяннямі асабіста канцлера Германіі Олафа Шольца. Задаволены палітыкай Шольца толькі 27 працэнтаў апытаных.

### Кітай заявіў, што свет павінен дзейнічаць разам супраць абмежаванняў Захаду

Захад спрабуе шляхам абмежаванняў стрымаць развіццё глабальнага Поўдня, неабходна разам адстойваць свае правы. Аб гэтым заявіў кіраўнік бюро па даследаванні і развіцці міжнароднага дэпартамента ЦК Камуністычнай партыі Кітая (КПК) Цзінь Сінь, выступаючы на міжнародным міжпартыйным форуме ў фармаце «БРІКС і краіны-партнёры» — «Сусветная большасць за шматпалярны свет», які «Адзіная Расія» праводзіць ва Уладзівастоку. На мерапрыемстве сабраліся прадстаўнікі вядучых палітычных сіл з 32 краін, у тым ліку з Азербайджана, Беларусі, Венесуэлы, Інданезіі, Камбоджы, КНР, Кубы, Лаоса, Таджыкістана, Тайланда, Эфіопіі і іншых. Аб гэтым паведаміла ТАСС. «Глабальны Поўдзень стаў значнай сілай. У той жа час несправядлівыя практыкі працягваюць стрымліваць яго развіццё, — сказаў ён. — У прыватнасці, абмежавальныя механізмы Захаду ўстаўляюць палкі ў колы нашага супрацоўніцтва». Паводле меркавання Цзінь Сіня, трэба практыкаваць канкрэтныя падыходы, каб «глабалізацыя стаяла на варце нашых інтарэсаў». «Выкарыстоўваючы прынцыпы інклюзіўнасці, мы зможам забяспечыць свой удзел у сацыяльна-эканамічным развіцці свету», — заявіў ён.

### Забруджванне паветра стала прычынай заўчаснай смерці 135 мільёнаў чалавек



Навукоўцы выявілі, што дробнадысперсныя цвёрдыя часціцы PM 2,5 (памерам 2,5 мікрона), якія выдзяляюцца з прамысловымі і транспартнымі выкідамі, а таксама ў выніку прыродных з'яў аказваюць згубны ўплыў на здароўе чалавека з-за здольнасці пранікаць у крывяносную сістэму. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на газету South China Morning Post. Даследчыкі лічаць, што забруджванне паветра мікрачасціцамі стала адной з прычын узнікнення інсультаў, анкалагічных захворванняў, хвароб сэрца і лёгкіх. Па выніках даследавання навукоўцаў з Наньянскага ўніверсітэта Сінгапура, з 1980 да 2020 года больш за 98 мільёнаў заўчасных смерцяў, звязаных з наступствамі забруджвання паветра, прыйшлося на краіны Азіі. У прыватнасці, найбольшаму ўздзеянню падвергліся жыхары Бангладэш, Індыі, Інданезіі, Кітая, Пакістана і Японіі.

ISSN 1990 - 763X

### КОРАТКА

- **Згодна з першай ацэнкай ВУП за першыя пяць месяцаў гэтага года, аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў Br91,5 млрд, або ў супастаўных цэнах 105,2 працэнта да ўзроўню студзеня — мая 2023 года.**
- Сярэднямесячная заработная плата па Міністэрстве прамысловасці за студзень — красавік гэтага года склала Br2376,9, або 113,5 працэнта ад агульнарэспубліканскага ўзроўню.
- **Нарыхтавана 6212,9 тыс. т сенажу — 46,6 працэнта да плана (у тым ліку ў палімерную ўпакоўку 190 тыс. т), 101 тыс. т сена (14,4 працэнта) і 210,2 тыс. т сіласу (1,02 %).**

Перспектыва

## Свет выратуе навука

### Як у Беларусі развіваюцца біятэхналогіі?

**Вы паспелі падзабыцца на пандэмію ковіду, калі не выходзілі з дому без маскі і ўздрыгвалі, калі хтосьці побач чхне? З вялікай доляй верагоднасці гэты час усім нам наканавана перажыць зноў. Чалавецтва чакае новая пандэмія, папярэдзіў дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй ГАНЧАРОЎ. На гэты раз — пандэмія грыпу H5N1. І рыхтавацца да яе трэба ўжо цяпер.**



### Да пандэміі падрыхтаваліся

Аб тым, што трэцяе тысячагоддзе будзе эпохай пандэмій, мікрабіёлагі і вірусолагі гавораць і пішуць ужо з яго пачатку. І вось новая пандэмія, цалкам верагодна, на парозе.

— Гэта дастаткова сур'ёзная праблема: мяркуецца, што ў недалёкай будучыні свет атрымае пандэмію, і хутчэй за ўсё, гэта будзе пандэмія грыпу, — сказаў Андрэй Ганчароў. — Калі яе чакаць? На гэтае пытанне ніхто не адкажа. Але ў свеце ўвесь час рэгіструюцца ўспышкі віруса грыпу, у асноўным гэта вірус грыпу птушак, яго самыя розныя формы. У ЗША захворванне пачалося з Тэхаса, трэці хворы — у штаце Мічыган, і гэта вірус H5N1. У Мексіцы нядаўна памёр пацыент з вірусам грыпу H5N2. Вірус грыпу характарызуецца вельмі высокай здольнасцю да мутацый, і калі ў адным арганізме злучаюцца два розныя вірусы грыпу, яны могуць абменьвацца ўчасткамі геному — адбываецца так званая рэкамбінацыя. Атрыманы вірус можа мець самыя непрадказальныя біялагічныя ўласцівасці.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года
Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ЭКАНОМІКА ПАКУЛЬ СКЛАДВАЕЦЦА, ХОЦЬ ЁСЦЬ ФАКТАРЫ, ЯКІЯ НАСЦЯРОЖВАЮЦЬ»

**У тэму**

## Сітуацыя нядрэнная

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Журналісты пацікавіліся ў Рамана Галоўчанкі, наколькі адмоўнае сальда, на якое звяртаў увагу Прэзідэнт, бачыцца сур'ёзным выклікам для нашай эканомікі. Па словах прэм'ер-міністра, асаблівай катастрофы тут няма. «Калі казаць аб прычынах, то яны празаічныя: цана на нафту вырасла, мы купляем сырую нафту, што паўплывала на павелічэнне кошту імпарту. Недзе знізіліся цэны на традыцыйныя беларускія тавары на знешніх рынках, хоць мы павялічылі фізічны аб'ём экспарту амаль на 9 працэнтаў, але ў грашах атрымалі крыху менш з-за цанавой прасадкі. З красавіка мы назіраем адваротную дынаміку: цэны сталі падрастаць. Пакуль лічба адмоўнага сальда не выклікае занепакоенасці і яна будзе перакрыта па выніку трох кварталаў», — адзначыў ён.

У цэлым, па тым, якімі бачацца эканамічныя вынікі года, кіраўнік урада падкрэсліў, што знешняя сітуацыя прасцейшай не становіцца, эканамічныя санкцыі не спыняюцца, але, нягледзячы на ўсе праблемы, беларускі экспарт расце, у тым ліку за кошт краін далёкай дугі — афрыканскага кантынента, Блізкага Усходу. «Ужо запрацавалі новыя ланцужкі лагістычныя, фінансавыя, вытворчыя. Мы абавязаны выканаць усе задачы, якія стаяць перад эканамічным блокам краіны, — сказаў Раман Галоўчанка. — Пакуль цяжка сказаць, якія будуць вынікі года. Але сёння сітуацыя складваецца нядрэнна. Я думаю, пры належным узроўні ўнутранай мабілізацыі і настроенасці на вынік усё будзе дасягнута».

Прэм'ер-міністр заўважыў, што трэба падцягнуць экспартныя паказчыкі са 102 да 104 працэнтаў. Па яго словах, гэта цалкам магчыма. «Сёння складваецца сітуацыя, калі па розных таварных пазіцыях прыходзіцца выбіраць, куды пастаўляць — на рынак найбліжэйшы ці рынак далёкі. Мы безумоўна выконваем усе абавязацельствы перад нашымі расійскімі калегамі, а лішкі адпраўляем далей», — сказаў Раман Галоўчанка. Кіраўнік урада заўважыў, што замежныя паездкі Прэзідэнта надалі дадатковы імпульс супрацоўніцтву на знешнім контуры і эканамічным праектам. Падобныя паездкі будуць працягвацца, запланаваны візіты і паездкі на ўрадавым узроўні, супрацоўніцтва ў рамках міжнародных аб'яднанняў. «Я бачу, што ў нас назіраецца сур'ёзная актывізацыя знешнеэканамічнай дзейнасці», — падсумаваў Раман Галоўчанка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Парламенцкі дзённік

# Прапановы з разлікам на далёкую будучыню

## У Мінску прайшла 66-я сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі

**Асаблівасцю пасяджэння стала тое, што ў ім узялі ўдзел нядаўна выбраныя парламентарыі Нацыянальнага сходу Беларусі. Гэтая акалічнасць патрабуе абнаўлення кіруючых органаў Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Невыпадкова саюзныя парламентарыі пачалі сваю работу з арганізацыйных пытанняў. На парадку дня — і «Урадавая гадзіна» на тэму «Фарміраванне і развіццё агульнай навуковай і адукацыйнай прасторы ў рамках Саюзнай дзяржавы». Перад саюзнымі парламентарыямі выступілі кіраўнікі профільных міністэрстваў і дзяржаўных арганізацый. Пытанні, адрасаваныя ў іх адрас, датычыліся ўдасканалення інтэграцыйных працэсаў, глабальных выклікаў і пагроз у сферы навукі і адукацыі.**


Фота БелТА.

Найперш саюзныя парламентарыі выбралі першага намесніка Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Ім стаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Сергяенка. Акрамя таго, выбраны намеснікі Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Гэтыя пасады занялі намеснікі старшыняў Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Сяргей Хаменка і Вадзім Іпатаў. Таксама запоўнены вакансіі старшыняў камісій Парламенцкага Сходу.

### Ад умацавання маральных асноў да пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва

Прывітаўшы расійскіх калег на гасціннай беларускай зямлі і падзякаваўшы ўдзельнікам пасяджэння за аказаны давер у сувязі з выбраннем на высокую пасаду, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** выказаў упэўненасць, што абноўлены склад Парламенцкага Сходу захавае пераемнасць і будзе развіваць усё найлепшае, што напрацавана практыкай.

«Лідары нашых краін вызначылі стратэгічныя кірункі развіцця саюзнага будаўніцтва, — нагадаў ён. — Наша сумесная дзейнасць павінна быць накіравана на іх максімальную рэалізацыю і рэзультатыўнасць. У рамках выканання задач, ускладзеных на Парламенцкі Сход, прапануецца ўдзяліць асаблівую ўвагу наступным аспектам. У студзені бягучага года Вышэйшым Дзяржаўным Саветам Саюзнай дзяржавы зацверджаны Асноўныя кірункі рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады. Неабходна задзейнічаць патэнцыял камісій Парламенцкага Сходу для кантролю за ходам іх выканання і своечасовага рэагавання ў выпадку ўзнікнення любых затрымак у рэалізацыі мерапрыемстваў, прадугледжаных гэтым дакументам».

Па словах Ігара Сергяенкі, таксама трэба адсочваць эфектыўнасць ажыццяўлення праграм і мерапрыемстваў, якія фінансуюцца з бюджэту Саюзнай дзяржавы. Акрамя таго, важна сфарміраваць задзел для новых сумесных праграм і мерапрыемстваў. «Асаблівы акцэнт трэба зрабіць на тэмах, якія забяспечваюць тэхналагічны суверэнітэт Саюзнай дзяржавы, высокую прадукцыйнасць працы і бяспечнае лічбавае развіццё, — канкрэтызаваў спікер. — Таму прапаную больш шырока выкарыстоўваць пляцоўкі Парламенцкага Сходу (і пасяджэнні камісій, і парламенцкія слуханні, і пастаянна дзеючыя семінары) для падрыхтоўкі і рэалізацыі адпаведных прапаноў. Варта глядзець не толькі ў заўтрашні дзень, але і ў далёкую будучыню. На гэта накіравана зацверджаная Вышэйшым Дзяржаўным Саветам Стратэгія навукова-тэхналагічнага развіцця Саюзнай дзяржавы на перыяд да 2035 года».

Пры гэтым, як падкрэсліў першы намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, саюзныя парламентарыі не павінны забываць і пра гуманітарную сферу. Тут, па яго меркаванні, першачарговую ўвагу неабходна ўдзяліць моладзі, умацаванню ў грамадстве маральных асноў, духоўнасці, традыцыйных каштоўнасцяў, грамадзянскай самасвядомасці і патрыятызму. «Адным словам, патрабуецца сур'ёзная праца над тым, што фарміруе непахісную аснову адзінства народаў Беларусі і Расіі», — акцэнтаваў увагу Ігар Сергяенка.

Ён адзначыў, што ў мэтах садзейнічання міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву Беларусі і Расіі трэба працягнуць правядзенне пасяджэнняў парламенцкіх камісій у рэгіёнах, садзейнічаць адкрыццю новых кірункаў у гэтай сферы. «Мы і ў далейшым павінны ставіць канкрэтныя задачы, шчыра гаварыць аб самых вострых праблемах, якія хвалююць нашых грамадзян, — паставіў задачу Ігар Сергяенка. — Гэта наш прамы абавязак як парламентарыяў. Перакананы, што XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які ў самы бліжэйшы час пройдзе ў Віцебску, Полацку і Наваполацку, надасць дадатковы імпульс і дынаміку гэтаму працэсу».

Кажучы аб знешнім контуры, Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што агульнай мэтай павінна стаць пашырэнне міжнароднага ўзаемадзеяння Парламенцкага Сходу. «Наш голас павінен гучаць у Міжпарламенцкім саюзе, — удакладніў ён. — Неабходна наладзіць шчыльнае супрацоўніцтва і з такімі аўтарытэтнымі арганізацыямі, як Міжпарламенцкая Асамблея АСЕАН, Панафрыканскі парламент і Парламент краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. Сёння гэта надзвычай актуальна з пункту гледжання ўмацавання міжнародных пазіцый Саюзнай дзяржавы, прасоўвання яе інтарэсаў, асабліва ў святле працэсаў фарміравання шматпалярнага свету. Дзейнасць Парламенцкага Сходу ва ўсіх сферах павінна ажыццяўляцца ў цесным кантакце з Пастаянным Камітэтам Саюзнай дзяржавы, міністэрствамі і ведамствамі Беларусі і Расіі, камісіямі і камітэтамі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі. Любыя ініцыятывы, якія вартыя ўвагі, павінны ўлічвацца».

Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што сесія праходзіць напярэдадні найважнейшай гістарычнай даты — 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Нашы бацькі і дзяды змагаліся з гітлераўцамі і іх памагатымі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — нагадаў спікер. — Сярод іх многія ўдзельнічалі ў стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», вынікам якой стала поўнае вызваленне Беларусі. Хачу падкрэсліць важнасць захавання гэтых і іншых гераічных і трагічных старонак нашай агульнай гісторыі не толькі для сябе, але і для нашчадкаў. Ад таго, якімі каштоўнасцямі яны будуць кіравацца, якія ставіць перад сабой мэты, да чаго імкнуцца, будзе залежаць будучыня Саюзнай дзяржавы».

Рэзюмуючы, Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што беларускія парламентарыі расцэньваюць удзел расійскай дэлегацыі ва ўрачыстых мерапрыемствах 3 ліпеня ў Мінску як цудоўную магчымасць яшчэ раз сустрэцца, прадэманстраваць свету згуртаванасць Беларусі і Расіі, а таксама імкненне ўмацоўваць сяброўства і супрацоўніцтва паміж нашымі народамі.

### «Фармат Саюзнай дзяржавы сябе не вычарпаў»

Пасля арганізацыйнай часткі адбылася «Урадавая гадзіна» на тэму «Фарміраванне і развіццё агульнай навуковай і адукацыйнай прасторы ў рамках Саюзнай дзяржавы».

«Нашы прэзідэнты Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін і Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка шмат робяць для інтэграцыі і развіцця адносін паміж нашымі дзяржавамі, — падкрэсліў **Старшыня Дзяржаўнай думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Вячаслаў ВАЛОДЗІН**. — Фармат Саюзнай дзяржавы сябе далёка не вычарпаў. У нас вялізныя магчымасці для таго, каб рабіць усё для фарміравання адзінага прававога поля, прымаючы мадэльныя законы, займаючыся гарманізацыяй заканадаўства. Але ўзнікае пытанне: а наколькі мы эфектыўна вырашаем гэтыя задачы? Наколькі мы эфектыўна вырашаем задачы заканадаўчага забеспячэння рашэнняў, прынятых на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў? Наколькі эфектыўны ў гэтым пытанні наш урад, міністэрствы? Калі рашэнні па фарміраванні агульнага прававога поля, падыходаў выпрацаваны, варта прымаць нарматыўныя акты, законы і, такім чынам, вырашаць праблему. Таму мы з вамі павінны задаць пытанне нашым калегам з выканаўчай улады: чым ім дапамагчы, якія законы прыняць, што дазволіць сфарміраваць адзіную ў дадзеным выпадку прастору ў сферы навукі і адукацыі».

Выступаючы з дакладам, **міністр адукацыі Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ** акцэнтаваў увагу на роўных правах у атрыманні адукацыі грамадзян Расіі і Беларусі. «Для расійскіх грамадзян існуе некалькі варыянтаў паступлення для навучання ў ВНУ Беларусі, — канкрэтызаваў ён. — З гэтага года ў грамадзян Расійскай Федэрацыі ёсць магчымасць паступіць у ВНУ Беларусі па выніках здачы адзінага дзяржаўнага экзамену. Больш за тысячу бюджэтных месцаў па педагагічных, інжынерных, сельскагаспадарчых і іншых кірунках выдзелены, каб дзеці з Расійскай Федэрацыі маглі паступіць ва ўсе ВНУ Рэспублікі Беларусь. Безумоўна, яны будуць мець магчымасць і працаўладкавацца на адпаведныя прадпрыемствы як Беларусі, так і Расіі».

Захоўваецца магчымасць паступлення расійскіх грамадзян у беларускія ВНУ і па выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання. «Пры гэтым рэалізуюцца адзіныя правы і на ўсе бюджэтныя месцы могуць прэтэндаваць хлопцы і дзяўчаты з Расійскай Федэрацыі, — удакладніў Андрэй Іванец. — Як вынік, сёння ў ВНУ Расіі навучаецца каля 12 тысяч студэнтаў з Рэспублікі Беларусь, у ВНУ Рэспублікі Беларусь — каля 2,5 тысячы грамадзян Расійскай Федэрацыі. Упэўнены, тут ёсць патэнцыял для пашырэння».

Дарэчы, восем беларускіх ВНУ рэалізоўваюць праграмы сумеснай адукацыйнай падрыхтоўкі, калі два гады праходзіць навучанне на базе беларускіх ВНУ і два — на базе расійскіх ВНУ.

У сваю чаргу, спікер Дзяржаўнай думы звярнуў увагу на неабходнасць укамплектаванасці кадрамі прадпрыемстваў Беларусі і Расіі за кошт мэтавага набору. Таксама Вячаслаў Валодзін лічыць, што варта зрабіць даступнымі аспірантуры саюзных ВНУ для хлопцаў і дзяўчат як з Расіі, так і з Беларусі. «Гэта пытанне фарміравання будучыні, падстава для таго, каб былі адкрыцці, і мы не толькі дасягалі мэт, але і інтэгравалі адукацыйныя прасторы», — падкрэсліў старшыня Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

### Дапамога дзецям Данбаса працягнецца

Падчас сесіі былі разгледжаны пытанні аб рабоце Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі ў 2023 годзе, аб праекце Дэкрэта Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2023 год», аб справаздачы Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы аб выкананні бюджэту Саюзнай дзяржавы за 2023 год.

У ходзе свайго выступлення **Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** адзначыў, што сёлета будзе працягнута работа па аказанні гуманітарнай дапамогі дзецям Данбаса. «Мы сапраўды з вялікай удзячнасцю аднесліся да рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна аб сістэмнай рабоце па аказанні гуманітарнай дапамогі, — дадаў ён. — Што датычыцца хамскага, бессаромнага перакручвання фактаў, якое дапускаюць перш за ўсё збеглыя 2020 года, знаходзячыся ў Прыбалтыцы і Польшчы... 2150 дзяцей, у тым ліку за кошт бюджэту, прайшлі аздараўленне ў Рэспубліцы Беларусь, 2150 дзяцей вярнуліся ў Данецкую і Луганскую рэспублікі. Мы ўжо не раз казалі аб гэтым: ні адно дзіця не згубілася, ні адно дзіця не захварэла, не зламала нагу і не атрымала нейкія калецтвы. У кожнага дзіцяці ў папцы «Асабістая справа» ёсць дазвол бацькоў або органаў апекі. Факты фальсіфікацый, перакручвання з боку заходніх партнёраў працягваюцца. Ні аднаго выпадку няма, а гэта пададзена ў палітычнай кан'юнктуры для таго, каб яшчэ раз наваліцца ў тым ліку на Беларусь, дзе дзеці адпачываюць».

У гэтай сувязі дзяржсакратар папрасіў саюзных парламентарыяў аб асобнай рэзалюцыі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі аб прасоўванні больш дакладнай пазіцыі ў падтрымку ініцыятывы кіраўнікоў дзяржаў, Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы аб аказанні сістэмнай гуманітарнай дапамогі ў адрас дзяцей ДНР і ЛНР.

### Вялікія магчымасці Саюзнай дзяржавы

Па выніках 66-й сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі Вячаслаў Валодзін і Ігар Сергяенка адказалі на пытанні журналістаў.

Як адзначыў Старшыня Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, сёлета 8 снежня будзе 25 гадоў Саюзнай дзяржаве. «Сёння можна сказаць, што Саюзная дзяржава адбылася, — падкрэсліў Вячаслаў Валодзін. — Пры гэтым яе патэнцыял недастаткова выкарыстаны, магчымасці вялікія. І нам са свайго боку трэба зрабіць усё для таго, каб мы эфектыўна вырашалі ўскладзеныя на нас задачы нашымі парламентамі, выбаршчыкамі. Грамадзяне нашых краін хочуць жыць у міры, дружбе, развіваючы адносіны. І калі казаць аб Парламенцкім Сходзе, то гэта добрая форма развіцця адносін. Мы абмяркоўваем пытанні гарманізацыі заканадаўства, у шэрагу выпадкаў прымаем мадэльныя законы — гэта ўсё нам дазваляе больш эфектыўна фарміраваць прававое поле».

Па словах першага намесніка Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, падчас пасяджэння сесіі адбыўся жывы абмен меркаваннямі, прыводзіліся прыклады ранейшай паспяховай сумеснай работы, што сведчыць аб пераемнасці ў рабоце Парламенцкага Сходу, нарадзіліся новыя ідэі і прапановы. «Мы шануем сяброўства з Расійскай Федэрацыяй, і я ўпэўнены, што сённяшняя сесія надасць імпульс нашай далейшай сумеснай рабоце, а вынікам з'явяцца новыя ідэі, самае галоўнае — увасабленне іх у жыццё», — рэзюмаваў Ігар Сергяенка.

**Вераніка КАНЮТА.**

**У тэму**

Як заўважыў у размове з журналістамі **дэпутат Дзяржаўнай Думы, намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу па прыродных рэсурсах, экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя Мікалай ВАЛУЕЎ**, прыклад узаемаадносін Беларусі і Расіі можна паказваць усяму свету. Па яго меркаванні, пераймання заслугоўвае тое, што мы адзін непадзельны народ, шматнацыянальны, замацаваны гісторыяй, адной Вялікай Перамогай.

«Аб'яднаная Еўропа зноў спрабуе ладзіць «крыжовы паход» на Усход, — сказаў дэпутат Дзярждумы. — Цяпер усё гэта феерычна больш складана, бо валоданне ядзерным арсеналам — гэта, напэўна, адзіная прычына, па якой мы дагэтуль не знаходзімся ў фазе гарачай вайны. Нашы прэзідэнты не раз адзначалі, што калектыўная бяспека АДКБ, у якую ўваходзяць Беларусь і Расія, у свой час была важнай ініцыятывай для ўсіх суверэнных краін, якія засталіся пасля развалу Савецкага Саюза. І гэта фактычна ратавала дзяржавы ад развалу і дзяржперавароту. Гэта датычыцца і многіх эканамічных вострых пытанняў, з дапамогай якіх у тым ліку на нашы краіны спрабуюць ціснуць. Што ў піку гэтаму супрацьстаўляем? У першую чаргу гістарычнае яднанне і гатоўнасць ісці плячо ў плячо разам і абараняцца. Абараняцца эканамічна, ваенным шляхам, якім заўгодна. Мы яшчэ раз даказваем, што гэты саюз, як у старым гімне Савецкага Саюза, непарушны. І тыя, хто спрабуе выпасці з яго, церпіць ад гэтага толькі адны страты».

**Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Камісіі Парламенцкага Сходу па культуры, навуцы і адукацыі Міхаіл МІРОНЧЫК** канстатаваў, што ў рамках Саюзнай дзяржавы існуе шмат сумесных праектаў, якія датычацца ўзаемадзеяння на ўзроўнях агульнай сярэдняй адукацыі і вышэйшай адукацыі. «Гэта і шматлікія конкурсы, і алімпіядны рух на ўзроўні вышэйшай адукацыі, гэта асацыяцыя ўстаноў вышэйшай адукацыі, якая ўжо створана і працуе, — канкрэтызаваў дэпутат Палаты прадстаўнікоў. — Кожнага з нас хвалюе пытанне яшчэ больш шчыльнага ўзаемадзеяння на ўсіх узроўнях адукацыйнай дзейнасці Саюзнай дзяржавы. Мы сёння сумесна працуем над тым, каб нашы сістэмы адукацыі зблізіліся і былі адзіныя падыходы ў адукацыйных стандартах на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, вышэйшай адукацыі. Нашых выпускнікоў школ хвалюе, дзе і як атрымаць прафесію. Расійская моладзь пытаецца, як можна паступіць у нашы ВНУ, а беларускія студэнты цікавяцца, якія спецыяльнасці можна атрымаць у расійскіх навучальных установах».

# На гасціннай Віцебскай зямлі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета нам выпаў гонар прымаць XI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, гэта маштабная падзея, якая накіравана на ўмацаванне інтэграцыйных сувязяў. Форум будзе адзінаццатым па ліку, таму яго ўдзельнікі будуць параўноўваць мерапрыемствы з папярэднімі — тут мы павінны не падвесці і нават здзівіць! Думаю, што ў нас гэта атрымаецца. Правядзенне Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі — чарговая магчымасць прадэманстраваць наш эканамічны, культурны і турыстычны патэнцыял, бо многія госці завітаюць да нас з розных куткоў Расіі.

***— Форум на віцебскай зямлі ўжо ўвайшоў у гісторыю, бо ўпершыню будзе праводзіцца адразу ў трох гарадах. У сувязі з чым было прынята менавіта такое рашэнне?***

— Так, сустракаць гасцей мы будзем у Полацку, Наваполацку і Віцебску. Кожны горад унікальны, са сваімі асаблівасцямі, якія мы хочам прадэманстраваць. У Полацку зараджалася беларуская дзяржаўнасць, Віцебск вядомы сваімі інавацыйнымі падыходамі ў розных галінах эканомікі, маладзёжным патэнцыялам, культурнай спадчынай, а Наваполацк — прамысловы гігант нафтахіміі краіны, які стаў драйверам эканамічнага развіцця Віцебшчыны.

Форум рэгіёнаў — гэта не толькі работа секцый і пленарныя пасяджэнні, абмен думкамі, дасягненнямі, але і дэманстрацыя турыстычнай прывабнасці рэгіёна. У нас багатая гісторыя, нам ёсць чым ганарыцца, значыць, мы павінны гэта паказаць нашым гасцям.

***— Адпаведна, і падрыхтоўка да мерапрыемства праходзіць ва ўзмоцненым трайным рэжыме. Раскажыце, якія аб'екты зведалі рамонтныя работы і атрымалі другое нараджэнне?***

— На працягу некалькіх напружаных месяцаў нашы гарады былі падобныя на адну вялікую будоўлю, цяпер спецыялісты ўносяць апошнія штрыхі. У Віцебску ў рамках падрыхтоўкі да правядзення форуму акцэнт зроблены на аб'екты, ужо знаёмыя па «Славянскім базары». У рамках Дзяржаўнай і рэгіянальнай інвестыцыйных праграм вядуцца будаўнічыя работы ў гасцініцы «Віцебск», канцэртнай зале «Віцебск», на плошчы Перамогі, у Летнім амфітэатры і яго культурна-спартыўным комплексе. Усяго на падрыхтоўку названых аб'ектаў прадугледжана 92 мільёны рублёў. На ўсіх аб'ектах работы вядуцца паскоранымі тэмпамі з прыцягненнем максімальнай колькасці спецыялістаў і будаўнічай тэхнікі.

У горадзе Полацку да прыёму ўдзельнікаў форуму рыхтуюцца ключавыя лакацыі горада, праводзіцца бягучы рамонт помнікаў архітэктуры і аб'ектаў добраўпарадкавання. У рамках інвестыцыйнай праграмы Віцебскай вобласці ажыццяўляецца фінансаванне аб'екта «Рэстаўрацыя з рэканструкцыяй будынка былога жылога корпуса францысканскага кляштара па вуліцы Ніжне-Пакроўскай, 20 у г. Полацку з прыстасаваннем пад музей археалогіі». Другое нараджэнне атрымаў і будынак былога Дома афіцэраў, які цяпер будзе філіялам Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай.

У горадзе Наваполацку ў рамках падрыхтоўкі да форуму вядзецца рамонт аб'ектаў вонкавага добраўпарадкавання і вулічна-дарожнай сеткі.

***— Раскажыце, якую культурную праграму рыхтуе паўночны рэгіён для гасцей і ўдзельнікаў форуму?***

— Падчас правядзення міжнароднага мерапрыемства Віцебск ператворыцца ў адну творчую пляцоўку, на якой будуць прадстаўлены традыцыйныя рамёствы паўночнага рэгіёна, мастацкая спадчына Марка Шагала, акцыі і падарункі гораду ад жыхароў.

Так, усе ахвотныя змогуць азнаёміцца з фотавыставай, прысвечанай гісторыі горада на Дзвіне, якая размесціцца на мосце 1000-годдзя. З 27 да 30 чэрвеня выстава-кірмаш мастакоў і рамеснікаў разгорнецца на вуліцах Суворава і Крылова. Свае работы ў тым ліку прадставяць члены Беларускага Саюза мастакоў і дызайнераў, для жыхароў і гасцей горада пройдуць майстар-класы па маляванцы, саломапляценні, роспісе па кераміцы, пляценні паясоў. У скверы Маякоўскага пройдзе арт-акцыя, у рамках якой мастакі будуць распісваць малыя скульптурныя формы жывёл па матывах работ Марка Шагала. 28 чэрвеня там жа адбудзецца прэзентацыя творчага праекта «1050 кветак любімаму гораду», дзе будуць прадстаўлены 22 дэкаратыўныя пано ў тэхніцы маляванкі. Іх на працягу некалькіх месяцаў стваралі не толькі майстры, але і ўсе ахвотныя віцябчане. Асноўным мерапрыемствам культурнай праграмы ў горадзе на Дзвіне для ўдзельнікаў, арганізатараў і гасцей форуму стане вячэрні канцэрт у Летнім амфітэатры 27 чэрвеня.

Полаччына плануе запрасіць на захапляльныя экскурсіі ў Сафійскім саборы, Музеі беларускага кнігадрукавання і Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага, былым Доме афіцэраў, на тэрыторыі Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага стаўрапігіяльнага манастыра з наведваннем Спаса-Праабражэнскай царквы XII стагоддзя.

***— Раскажыце, якія пагадненні па выніках мінулага форуму падпісала Віцебская вобласць з расійскімі калегамі? Якія планы ў паўночнага рэгіёна на будучы форум?***

— Падчас падрыхтоўкі і правядзення X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбыўся ў 2023 годзе ва Уфе, Віцебскім аблвыканкамам былі падпісаны планы мерапрыемстваў па рэалізацыі пагадненняў з адміністрацыяй Кастрамской вобласці і Урадам Рэспублікі Башкартастан Расійскай Федэрацыі.

У рамках XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі плануецца падпісаць 12 кантрактаў на суму каля 175 мільёнаў расійскіх рублёў і 29,14 мільёна долараў. Горад Віцебск рыхтуецца падпісаць пагадненне аб пабрацімстве з Сімферопалем, Браслаўскі раён — з горадам Ульянаўскам, Орша — з Балашоўскім муніцыпальным раёнам Саратаўскай вобласці... Акрамя таго, прапрацоўваецца пытанне падпісання «Дарожнай карты» паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і адміністрацыяй Валгаградскай вобласці Расійскай Федэрацыі аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і сацыяльна-культурным супрацоўніцтве на 2024—2026 гады. Дадзеныя дакументы дазволяць актывізаваць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва з прыцягненнем міністэрстваў, дэпартаментаў і ўпраўленняў рэгіёнаў, а таксама асобных прадпрыемстваў па ўзаемавыгадных кірунках супрацоўніцтва.

***— Немалаважную ролю ў супрацоўніцтве дзвюх краін адыгрывае патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. Культурна-адукацыйны праект «Цягнік Памяці», ініцыіраваны кіраўнікамі верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі, з'яўляецца адным з яго інструментаў. Наколькі гэты праект значны для паўночнага рэгіёна і па якім прынцыпе адбіраюцца ўдзельнікі?***

— Праект «Цягнік Памяці» — сапраўды запамінальная падзея для кожнага з яго ўдзельнікаў. Асноўны акцэнт сёлета будзе зроблены на памятнай даце — 80-годдзі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дадзены праект не толькі адыгрывае важную ролю ў патрыятычным выхаванні, пашырае веды пра падзеі гераічнага мінулага, але і аб'ядноўвае моладзь. На тэрыторыі Віцебскай вобласці практычна кожная школа носіць імя Героя Вялікай Айчыннай вайны або тых людзей, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі. Мы разумеем важнасць захавання памяці пра подзвіг тых людзей, дзякуючы якім наша рэспубліка застаецца суверэннай і свабоднай.

З кожным годам праект «Цягнік Памяці» набывае ўсё большую папулярнасць, а яго ўдзельнікамі імкнуцца стаць практычна ўсе дзесяцікласнікі краіны. Маладое пакаленне гатова пераадолець сотні кіламетраў шляху, каб аддаць даніну павагі гераічнаму подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сустрэцца з відавочцамі тых далёкіх падзей, пазнаёміцца са шматлікімі і ўнікальнымі помнікамі гісторыі і культуры, славутасцямі гарадоў і краін. Праектам цікавяцца, праектам натхняюцца. Школьнікі, якім пашчасціла ўзяць удзел у праекце, з цеплынёй і трапятаннем дзеляцца ўражаннямі з аднагодкамі, распавядаюць аб знакавых месцах і памятных сустрэчах, размяшчаюць каментарыі і відэарэпартажы.

Адбор удзельнікаў праходзіў на конкурснай аснове. На Віцебшчыне ў абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Я патрыёт сваёй краіны» ўзялі ўдзел 25 пераможцаў раённых, гарадскіх конкурсаў, якія маюць высокія паказчыкі ў вучобе, грамадскай, спартыўнай, валанцёрскай дзейнасці, лідары вучнёўскага самакіравання, актывісты грамадскіх арганізацый, якія навучаюцца ў ваенна-патрыятычных і кадэцкіх класах, выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў. Сёлета маршрут цягніка прадугледжвае наведванне Полацка — самага старажытнага горада нашай краіны, калыскі беларускай дзяржаўнасці, духоўнага і гістарычнага цэнтра. Моладзь Беларусі і Расіі наведае ў Наваполацку флагманы беларускай прамысловасці — ААТ «Нафтан» і «Палімір», мемарыяльны комплекс «Урочышча Пяскі», дзе захоўваецца памяць аб бязвінных ахвярах фашызму. Сучаснасць і гісторыя народа цесна пераплятаюцца і адлюстроўваюцца ў дачыненні да духоўных святыняў. Удзельнікі праекта пазнаёмяцца з саборамі і манастырамі Полацкай зямлі, славутасцямі і музеямі, адукацыйнымі ўстановамі і маладзёжнымі ініцыятывамі.

***— Да Форуму рэгіёнаў засталося дзесяць дзён. З якім настроем кіраўніцтва вобласці рыхтуецца сустракаць гасцей?***

— Гэта знакавая падзея не толькі для вобласці, але і для краіны. Безумоўна, наша задача — зрабіць усё на найвышэйшым узроўні. Хвалюемся, таму што адчуваем велізарную адказнасць прымаць Форум рэгіёнаў. У першую чаргу мы нацэлены на плённую работу на карысць умацавання і далейшага супрацоўніцтва рэгіёнаў дзвюх краін. Падчас форуму будуць падпісаны кантракты, а значыць, беларуска-расійская эканоміка стане яшчэ больш магутнай, а гэта, безумоўна, адлюструецца на дабрабыце жыхароў нашых краін!

***— Дзякуй за размову.***

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Выбіраю «Звязду»

# «Газета падабаецца за мову...»

## На свяце лялькі ў Круглым карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася з мясцовымі падпісчыкамі

**У мінулую суботу Цэнтральны парк культуры і вольнага часу ў Круглым на некалькі гадзін пераўтварыўся ў сапраўднае царства лялькі. Яны тут прысутнічалі адразу ва ўсіх відах: на малюнках, у вырабах і нават жывыя. Раённы аддзел культуры паклапаціўся, каб незвычайнае свята сабрала як мага больш гасцей. У ім удзельнічалі не толькі школы, бібліятэкі і клубы, але і прадпрыемствы, арганізацыі сельсаветы.**

— Налета нашаму святу спаўняецца 10 гадоў, — расказвае **загадчыца сектара культуры Круглянскага райвыканкама Аксана ДЗЕРУНОВА.** — Пачыналася яно як свята рамёстваў, а потым пераўтварылася ў свята лялькі. Гэта ж адна з важных традыцый беларускага народа. Мы нараджаемся, расцём з лялькай, напэўна, усе сакрэты ёй расказваем і нават дарослымі звяртаемся да лялек. Абавязкова праводзім конкурс, пераможцаў вызначаем адразу ў некалькіх намінацыях: «Малюнак», «Мая любімая лялька», «Сучасная лялька», «Міфы і легенды роднага краю», «Лялька, зробленая сваімі рукамі» — «Традыцыйная» і «Лялька-прафесія».





Ёсць таксама намінацыя «Жывая лялька». Намінацыю «Лялька-прафесія» прыдумалі нядаўна, хацелася, каб арганізацыі, якія працуюць у раёне, прыклалі свае рукі. Атрымліваецца вельмі незвычайна. Сёлета нам на конкурс прадставілі ляльку-настаўніцу, ляльку-мастака, з Талачына перадалі ляльку-каваля.

Цікава было прайсціся па лялечных радах. Тут табе і русалкі, і лялькі-сімвалы, і берагіні. У госці з другога краю вобласці прыехалі майстрыхі Хоцімскага Дома рамёстваў. Многім ужо знаёмыя лялькі Таццяны Навумавай.

Быхаўскі раён таксама прывёз лялькі на любы густ. Майстар народнай творчасці Ірына Фадзеева, якая займаецца іх вырабам, расказала, што дзве іх рукатворныя прыгажуні ўдзельнічаюць у конкурсе. І вельмі хочацца, каб іх адзначылі.

— Мы тут не ўпершыню, у конкурсе ўдзельнічаем заўсёды, — удакладняе майстрыха. — І на трэцім месцы былі, і на другім. Расцём. Калі сур'ёзна, то лялька — гэта вельмі важны атрыбут у жыцці чалавека. У кожнага яна свая. Маленькімі гулялі ў лялькі і цяпер не разлучаемся. У свой час я працавала ў школе майстрам працоўнага навучання. А калі школа закрылася, прыйшла ў Цэнтр культуры і рамёстваў, дзе і захапілася лялькай.

— Лялька — гэта ўвасабленне самога сябе, — дапаўняе калегу яшчэ адна быхаўская майстрыха. — Яна заўсёды падобная на свайго аўтара.

Быхаўскія майстры прывезлі таксама розныя вырабы ручной работы. Тут і тэкстыльныя ўпрыгожванні, і чычкаўскае пляценне, і коўдрачкі з абрэзкаў, і сумкі са шнуроў.

Працавалі лакацыі ад сельсаветаў, клубнай сістэмы, школ, нават круглянскай Свята-Троіцкай царквы. Месцічы ведаюць, якія смачныя булачкі выпякаюць у храме, і загадзя цікавяцца. Ну, а анёльчыкі, створаныя рукамі дзяцей нядзельнай школы, заўсёды купляюць з задавальненнем. Кажуць, што яны ўзнімаюць настрой.

Круглянскі цэнтр творчасці дэманстраваў саламяных лялек і вырабы з бацiку. А раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання прапаноўваў згуляць у бяспройгрышную латарэю. На памяць можна было атрымаць сімпатычны сувенір, зроблены рукамі тутэйшых выхаванцаў. Аб'ядноўвае сацыяльная служба 27 чалавек, чатырох з якіх наведваюць дома, астатнія займаюцца ў гуртках па інтарэсах.

Кожны з удзельнікаў свята запрашаў дзяцей паўдзельнічаць у гульнях. Бібліятэка, школы, сельсаветы афармілі свае зоны з улікам дзіцячых запытаў. Нават санслужба з бальніцай у гульнявой форме запрашалі навучыцца правільна чысціць зубы, бо гэта вельмі важна для здароўя.

— У нас можна не толькі паглядзець, але і ўсё паспрабаваць, усяму навучыцца, — усміхаецца Аксана Дзерунова. — Звычайна на свята збіраецца да 300 чалавек. Летась было восем раёнаў, сёлета заяўлена дзевяць.

«Добрыя людзі, спяшайцеся, на свята лялькі збірайцеся!» — гучала са сцэны. І пад задорныя гукі і народныя спевы свята пакрысе запаўняла сабой увесь парк. І людзі ішлі разам з дзецьмі на гэтыя гукі.

На лаўках у глядзельнай зале пад адкрытым небам не было вольных месцаў. Прэзентацыя лялек — гэта заўсёды вельмі цікавая праграма з вершамі, песнямі, танцамі.

Дзяўчынка Маша расказвала са сцэны пра сваю ляльку — таксама Машу. Казала, што яе ўсяму вучыць маці, а яна — сваю ляльку. Перыядычна на сцэну выходзілі творчыя калектывы. Пявунні ў народных строях народнага фальклорнага ансамбля «Спадарыня» Чавускага раённага Цэнтра культуры і вольнага часу заспявалі і адразу ж завалодалі ўвагай. Свята гуло, смяялася, гаманіла дзіцячымі галасамі, клікала за сабой.

Сустрэча «Звязды» з падпісчыкамі добра ўпісалася ў свята. Шмат чаго агульнага. «Звязду» ў Круглым чытаюць і любяць. **Наша пастаянная чытачка Вольга МОЛНАР,** якая працуе ў сферы сацыяльнага абслугоўвання 27 гадоў, сябруе са «Звяздой» ужо пяць гадоў.

— Гэта найлепшае выданне ў Беларусі, на мой погляд, — кажа яна. — Падабаецца, што газета на беларускай мове. Карыстаюся тымі парадамі, якія там даюць па агародніцтве. Тую ж бульбу і агуркі як даглядаць, каб ураджай быў большы. Чытаю заўсёды рубрыку «Крынічка», а яшчэ падабаюцца матэрыялы пра прыроду. Хацелася б, каб больш пра сельскіх герояў пісалі. Прычым з сельскай гаспадаркі. Вельмі перажываю, што моладзь з'язджае з сяла. Калі любіш радзіму, павінен застацца на ёй і рабіць усё на яе карысць. А не гнацца за доўгім рублём.

Вольга паведаміла, што газету з задавальненнем чытае і яе маці. І яшчэ папрасіла напісаць, што Кругламу вельмі не хапае фізкультурна-аздараўленчага цэнтра. Калі б ён быў, разважае яна, магчыма, моладзь так імкліва не з'язджала б у горад.

Ад рэдакцыі Вольга Молнар атрымала ў падарунак стыльны нататнік і ручку з лагатыпам «Звязда» як напамін пра тое, што газета таксама ўдзячная кожнаму свайму чытачу.

А што датычыцца лялек: дыплом 1-й ступені «За самую лепшую ляльку» атрымала жыхарка Шклоўскага раёна Ірына Андросава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. Круглае.*

# І ЗНОЎ ЗАКРУЖЫЦЬ ФЕСТЫВАЛЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Артыст шмат распавёў пра свой творчы шлях і сям'ю.

— Я ганаруся тым, што нарадзіўся ў самым улонні беларускага народа. Я чуў беларускую мову не толькі з экранаў тэлевізараў, але і з вуснаў бабулі, сваіх родных і блізкіх. Беларускую песню я чуў не толькі ў харавых, аркестравых выкананнях, — чуў, як яна гучыць на цымбалах, гармоніку і на іншых музычных інструментах, якія рабілі майстры таго часу, — падзяліўся ён.

Закранулі ў размове і значнасць фестывалю ў Маладзечне. Па словах артыста, у самой яго назве закладзены галоўны сэнс: «беларускай песні і паэзіі».

— Такой колькасці беларускіх песень беларускіх аўтараў, якія гучаць тут, мы не пачуем ні на адным фестывалі ў Беларусі і за мяжой, — заключыў ён.

### Адкрываючы фестываль

Яркім акордам стала і ўрачыстае адкрыццё фестывалю на сцэне Летняга амфітэатра.

— 23-і год мы збіраемся разам на гэтай гасціннай маладзечанскай зямлі, вітаем сяброў, каб убачыць свае добрыя напрацоўкі, паказаць нашу творчасць, нашу «беларускасць», нашу гісторыю, спадчыну, — адзначыў **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** у дзень адкрыцця фестывалю. — Праходзячы па вуліцах Маладзечна, можна ўбачыць вялікую цікавасць да фестывалю ў жыхароў і гасцей горада. Фестываль кожны год набірае абароты, дадае і ўдзельнікаў — тых, хто мае вялікае жаданне прыехаць на гэту гасцінную зямлю і адпачыць душой, сэрцам. Тут асаблівая атмасфера, пануе вельмі добры настрой, павага да нашай культуры, нашай мовы.

Маладзечанская зямля збірае вядомых артыстаў, паэтаў, пісьменнікаў, кампазітараў. Больш за тое, фестываль у Маладзечне можа перарасці ў міжнародны. У гэтым годзе яго ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі дзевяці рэгіёнаў РФ.

Таксама падчас адкрыцця міністр культуры зачытаў і прывітальнае слова Прэзідэнта, у якім сказана, што форум на працягу многіх гадоў выконвае высакародную місію асветніцтва, заахвочвае да вывучэння багатай паэтычнай і песеннай спадчыны, садзейнічае захаванню і развіццю традыцый нацыянальнага мастацтва.

А далей грымнуў гала-канцэрт «Мелодыі сэрца» з яго яркімі кампазіцыямі ў выкананні Вікторыі Алешка, Уладзіміра Громава, Юліі Быкавай і іншых. Безумоўна, была выканана і вельмі важная традыцыя фестывалю: пачаць гала-канцэрт з аб'яднальнай песні «Талака».

### На паэтычнай ноце

Сярод насычанай праграмы фестывалю важнае месца заўсёды ўдзялялася паэтам і пісьменнікам. Так, з году ў год дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі адпраўляецца ў Вязынку на радзіму Янкі Купалы для таго, каб пачытаць свае найлепшыя вершы ў гэтым знакавым месцы.

— Для нас гэта вельмі хвалюючa, вельмі ганарова, пачэсна, бо там нас заўсёды чакае пясняр, які ў сваіх творах адлюстраваў наша беларускае, народнае, сваё, — падзялілася **першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.**

Паводле яе слоў, сёлета свята ў Вязынцы адметнае тым, што ўдзел у ім узялі як знакамітыя майстры слова, так і вялікая грамада маладых аўтараў.

— Хочацца, каб яны таксама адчулі дух фестывалю, яго настрой, каб яны разумелі, наколькі важна мастацкае слова ў сучасным свеце, як важна, каб гэтае слова было стваральным, а не разбуральным, — заключыла яна.

### Паказаць мастацтва

Складана ўявіць фестываль у Маладзечне без добрых экспазіцый. Сёлета ў выставачнай зале Палаца культуры



гледачам была прадстаўлена ўнікальная фотавыстава «Творцы». Яна складаецца з партрэтаў знакамітых дзеячаў культуры Беларусі, якія ўнеслі неацэнны ўклад у культурную спадчыну нашай краіны. Аўтар усіх гэтых здымкаў — **беларускі фотажурналіст Юрый ІВАНОЎ.** У прафесіі ён з 1960-х гадоў. За ўвесь гэты час з'явілася вялікае партфоліа з партрэтамі вялікіх людзей, легенд і класікаў.

— Усе героі выставы — гэта мае знаёмыя, сябры, людзі, з якімі сутыкнула прафесія і якія запалі ў сэрца, — падзяліўся фотажурналіст.

На адкрыцці выставы прысутнічалі і героі здымкаў. Сярод іх — кінааператар Юрый Ялхоў, беларускі кінарэжысёр Вячаслаў Нікіфараў і паэт Фёдар Баравы.

### Прагулка па горадзе майстроў

Здаецца, адна з самых яркіх і па-сапраўднаму народных старонак фестывалю — гэта горад майстроў. Ты можаш не трапіць на канцэрт ці адкрыццё выставы, але міма гулянняў на вуліцах горада прайсці немагчыма. Яны літаральна вабяць у свой чароўны свет.

Нашу ўвагу прыцягнулі дзіўныя габелены **майстра народнай творчасці Марыі СТАРАСЦІНАЙ** з Прылук. У яе асаблівы почырк і ўнікальны стыль.

— Мая мама была ткачыхай, а тата — мастаком. Так і атрымалася, што мая творчасць аказалася на сумежжы ткацтва і мастацтва. Габелен з прэтэнзіяй на рэалістычную карцінку — гэта маё ноу-хау, — расказала яна.

Не магла не прыцягнуць увагу і міжінтэрнацыянальная пляцоўка ад Смалявіч, у якой вырашылі сумясціць беларускую і кітайскую культуры.

— На тэрыторыі нашага раёна знаходзіцца беларуска-кітайскі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Канцэпцыя пляцоўкі — гэта беларускае і кітайскае сяброўства. Мы хацелі паказаць, чым нашы культуры адрозніваюцца і чым аб'ядноўваюцца. Насамрэч у нас шмат агульнага. Мы частавалі сёння кітайцаў нашым мятным чаем, а яны нам арганізавалі традыцыйную кітайскую чайную цырымонію, — падзяліўся **намеснік дырэктара Смалявіцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Уладзімір ГАЎРЫКАЎ.**

Сярод іншых забаў тут можна было прайсці майстар-клас па каліграфіі і вырабе лялькі-абярэга.

Прыцягвалі ўвагу і літаратурныя стэнды, дзе за правільны адказ на пытанне ці нават проста за прачытанне чатырохрадкоўя можна было атрымаць прыз. Так, на пляцоўцы ад народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь» з Валожына карэспандэнт «Звязды» выйграла чароўны яблык з літаратурнага саду. Кажуць, ён абавязкова павінен надзяліць свайго ўладальніка літаратурным дарам...

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

# Свет выратуе навука

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гаворачы аб вірусе, які сёння цыркулюе ў ЗША, вучоны адзначыў: для віруса птушынага грыпу нетыпова тое, што ён заражае буйную рагатую жывёлу.

— Вірусы лёгка пераходзяць міжвідавы бар'ер. Першы крок на шляху пераадолення міжвідавага бар'ера ўжо адбыўся. І калі цяпер вірус атрымае здольнасць лёгка распаўсюджвацца і высокую патагеннасць, тады гэта — патэнцыяльны пандэмічны штам. Да гэтага трэба рыхтавацца, — падкрэсліў вучоны. — Пандэмія грыпу сапраўды будзе, яе пазбегнуць немагчыма, да яе неабходна ўвесь час быць гатовымі.

Найважнейшай мерай вучоны назваў вакцынаванне ад звычайнага сезоннага грыпу.

— Па назіраннях, зробленых падчас пандэміі грыпу 2009—2010 гадоў, практычна ніхто з пацыентаў, прышчэпленых ад сезонных варыянтаў грыпу, не памёр ад пандэмічнага штаму, — падкрэсліў дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН. — Відавочна, што кожнай краіне неабходны свае распрацоўкі ў гэтай галіне, і кожная краіна павінна быць гатова да масавага выпуску сродкаў для прафілактыкі і лячэння. У Беларусі выпуск прэпаратаў супраць грыпу наладжаны на розных прадпрыемствах. Калі мы запусцім вытворчасць вакцын — будзе выдатна, — падвёў вынік Андрэй Ганчароў.

У нашай краіне распрацоўваецца айчынная вакцына супраць сезоннага грыпу, расказаў вучоны. І ўжо гатовы першыя прататыпы вакцыны супраць грыпу H5N1.

### Заслона на шляху хвароб

— Калі адбудзецца мутацыя гэтага віруса або яго рэкамбінацыя з іншымі вірусамі, новая пандэмія па ступені ўплыву на эканоміку і жыццё людзей будзе больш разбуральнай, чым Covid-19. Таму інстытут займаецца гэтай праблемай, і ў нас ужо ёсць першы прататып кандыдатнай вакцыны супраць грыпу H5N1, — удакладніў Андрэй Ганчароў.

Акрамя таго, распрацоўваюцца падыходы да стварэння вакцын на аснове адэнавірусных вектараў, якія будуць адрозніваюцца высокімі імунагеннасцю і хуткасцю распрацоўкі, расказаў ён.

— Гэта дазволіць хутка ствараць вакцыны супраць практычна любых вірусных захворванняў, — рэзюмаваў навуковец.

Вірусалогія — найважнейшы кірунак работы Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, адзначыў навуковец. Цэнтр эксперыментальнай вірусалогіі (як структура інстытута) быў уведзены ў эксплуатацыю крыху менш за год таму, і сёння дзве асноўныя яго распрацоўкі — вакцына супраць грыпу і платформа на аснове адэнавірусаў, што дазваляе распрацоўваць вакцыны для медыцыны і ветэрынарыі.

Не застаюцца без увагі вучоных і не менш важныя, хоць, магчыма, і менш тэрміновыя кірункі: Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН — адна з вядучых арганізацый Беларусі ў галіне распрацоўкі і прымянення біямедыцынскіх клетачных прадуктаў.

— Мы маем як лабараторныя комплексы, так і аддзяленні клетачнай тэрапіі, дзе клетачныя прадукты непасрэдна выкарыстоўваюцца для лячэння пацыентаў, — паведаміў Андрэй Ганчароў. — З зарэгістраваных у нашай краіне 16 біямедыцынскіх клетачных прадуктаў сем — айчынныя распрацоўкі. А за апошні год мы распрацавалі яшчэ дзевяць клетачных прадуктаў для лячэння самых розных захворванняў. Ідзе працэс іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

Так, у супрацоўніцтве з арганізацыямі Міністэрства аховы здароўя Інстытут біяфізікі і клетачнай інжынерыі распрацаваў метады лячэння найбольш цяжкіх захворванняў сучаснасці з выкарыстаннем клетачных прадуктаў.

— Гэта лячэнне раку ныркі, мачавога пузыра, цукровага дыябету 1-га тыпу, сістэмнага склерозу, гіпапаратырэёзу, дэфектаў касцей. Гэта тыя метады, якія паказаны ў выпадку неэфектыўнасці стандартнай тэрапіі па клінічных пратаколах, — распавёў вучоны.

### Адмысловы геном доўгажыхароў

Медыцына — галіна, дзе ў нашы дні навуковыя прарывы адбываюцца менавіта ў сферы біятэхналогій.

— Найважнейшы кірунак нашай работы — стварэнне геномных біятэхналогій для медыцыны і спорту, — расказаў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Павел МАРОЗІК.** — Мы працуем у галіне станаўлення персаналізаванай медыцыны, заснаванай на індывідуальных асаблівасцях чалавека, праводзім вывучэнне генетычных механізмаў развіцця хвароб, распрацоўваем метады ранняй ДНК-дыягностыкі, вывучаем генетычныя асновы індывідуальнай адчувальнасці да лекавых прэпаратаў. Даследаванні праводзяцца па шырокім спектры захворванняў: сардэчна-сасудзістыя, эндакрынныя, аўтаімунныя, анкапаталогіі.

Распрацоўваюцца фармакагенетычныя методыкі тэрапіі эпілепсіі, метады дыягностыкі і лячэння рэдкіх спадчынных захворванняў, расказаў Павел Марозік.

— Праведзены даследаванні па вывучэнні ролі мікрабіёму ў рэалізацыі асаблівасцяў геному доўгажыхароў Беларусі, — дадаў навуковец. — Выяўлены варыянты генаў, якія часцей сустракаюцца ў такіх людзей.

— Адна з нашых апошніх распрацовак — базавая генетычная канструкцыя, якая з'яўляецца асновай для атрымання РНК-вакцыны, — паведаміў **дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Аляксандр ШЭПШАЛЕЎ.** — Яна мае перавагу перад існуючымі: уводзіцца не інвазіўна, а праз дыхальныя шляхі і адрозніваецца высокай эфектыўнасцю лячэння на пачатковых стадыях развіцця віруса.

Ён адзначыў, што распрацоўка заснавана на айчынных штамах мікраарганізмаў.

— Мы пайшлі далей: распрацавалі штам-прадуцэнт ферменту, які выкарыстоўваецца для атрымання ад'юванту (узмацняльніка вакцын), і адпрацавалі носьбіт. Такім чынам, забяспечаны поўны цыкл стварэння вакцыны імпартазамяшчальным спосабам. Цяпер працуем з Міністэрствам аховы здароўя для ўключэння гэтых распрацовак у клінічную практыку. Атрыманы вынік — навуковая аснова для хуткай распрацоўкі шырокага пераліку вакцын новага пакалення з магчымасцю безынвазіўнага ўвядзення.

### Селекцыя — на ўзроўні клетак

Навукоўцам, якія працуюць у галіне біятэхналогій, здаецца, пад сілу вырашэнне самых складаных задач сучаснасці: не толькі вылечыць хваробы, што раней лічыліся прысудам, але і дасягнуць харчовай бяспекі, утылізаваць небяспечныя адходы, аздаравіць дэградавальныя глебы, навучыць расліны не баяцца марозу і спёкі, вывесці высокапрадукцыйныя пароды жывёл. У Беларусі біятэхналогіі развіваюцца актыўна, падкрэслілі прадстаўнікі НАН, і ў прыярытэце такія найважнейшыя кірункі, як ахова здароўя і аграрны сектар. У Нацыянальнай акадэміі навук наладжана вытворчасць інавацыйных біяпрэпаратаў для розных сфер: ад павышэння ўраджайнасці сельгаскультур, нарыхтоўкі кармоў, прафілактыкі і лячэння жывёл да ачысткі глеб і вадаёмаў, а ў сферы аховы здароўя распрацоўваюцца і ўкараняюцца ў вытворчасць айчынныя лекавыя прэпараты, заснаваныя на ўласных тэхналогіях ферментнага сінтэзу з супрацьпухліннай і імунастымуляцыйнай актыўнасцю, расказаў **акадэмік-сакратар аддзялення біялагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алег БАРАНАЎ.** Ён адзначыў, што аддзяленне біялагічных навук НАН уключае восем навукова-даследчых інстытутаў, дзве эксперыментальныя лясныя базы і завод біятэхналагічнага профілю.

— Біятэхналогія раслін развіваецца па трох кірунках, — распавёў акадэмік. — Першы — атрыманне пасадачнага матэрыялу раслін розных тыпаў, у тым ліку лясных, з ужываннем культуры клетак і тканак. Сучасныя метады дазваляюць атрымліваць аднамомантна вялікую колькасць пасадачнага матэрыялу, які мае генетычную ідэнтычнасць і вычышчаны ад вірусаў і іншых мікраарганізмаў. Важны момант: такі матэрыял можна атрымліваць цэлы год.

Другі кірунак у галіне біятэхналогіі раслін — клетачная селекцыя.

— У замкнёнай сістэме ствараюцца ўмовы, якія мадэлююць стрэс-фактары: павышаная тэмпература, недахоп вільготнасці, засоленасць глеб... Клеткі прыстасоўваюцца, выжываюць і даюць нашчадкаў, значна больш устойлівых да стрэс-фактараў, — растлумачыў навуковец.

І трэці кірунак — геномнае рэдагаванне: атрыманне раслін з зададзенымі ўласцівасцямі.

— Шэраг прыкмет раслін не карысныя для чалавека. Тэхналогіі накіраванай селекцыі дазваляюць выдаляць непатрэбныя прыкметы. Напрыклад, у драўніне змяшчаецца кампанент лігнін, які абцяжарвае працэс вытворчасці паперы і абумоўлівае яго дарагоўлю. «Выключэнне» або зніжэнне ўзроўню актыўнасці гэтага гена дазваляе атрымліваць расліны, што будуць больш эфектыўна выкарыстоўвацца для вытворчасці цэлюлозы, — сказаў Алег Баранаў.

### Для ўраджаяў і абароны прыроды

У сукупнасці з традыцыйнымі ведамі біятэхналогіі паспяхова вырашаюць як новыя (напрыклад у сувязі са змяненнем клімату), так і «адвечныя» задачы, што стаяць перад аграрыямі. Сярод апошніх распрацовак Інстытута мікрабіялогіі НАН — штамы-прадуцэнты, якія выпрацоўваюць фітагармоны, што спрыяюць выжывальнасці раслін у складаных умовах.



— Гэтыя штамы могуць выкарыстоўвацца як аснова для мікробных прэпаратаў, якія павышаюць устойлівасць сельгаскультур да неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя, — растлумачыў дырэктар Інстытута мікрабіялогіі.

Сярод новых распрацовак інстытута — інавацыйны мікробны прэпарат «Грамісіл».

— Ён створаны для азімай пшаніцы, прызначаны для перадпасяўной апрацоўкі насення і апырсквання раслін. Выкарыстанне прэпарату павялічвае ўраджай збожжа на 14-15 %, пры тым што доза мінеральных азотных і фосфарных угнаенняў зніжаецца на 30 %.

Расказаў Аляксандр Шэпшалеў і аб кармавых дабаўках новага пакалення «Селекорд-200» і «Селекорд-2000» на аснове дражджэй. «Селекорд-200» прызначаны для ўзбагачэння рацыёну маладняку буйной рагатай жывёлы: цяляты, якія атрымліваюць дабаўку, дэманструюць сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе вышэй на 7-9 % пры памяншэнні выдаткаў на кармы. «Селекорд-2000» павялічвае яйцаноскасць курэй, павышаючы ўтрыманне бялку, караціноідаў, вітаміну А і селену ў яйках. А кармавы дадатак «Апіфіл» — аснова для цукровых падкормак пчол, мае пралангіраванае дзеянне і паляпшае іх здароўе падчас зімоўкі.

Зніжэнне антрапагеннай нагрузкі (уплыву гаспадарчай дзейнасці чалавека на навакольнае асяроддзе) — яшчэ адна задача, вырашэнне якой — біятэхналогіі. І калі раней беларускія навукоўцы стваралі біядэструктары монапрадуктаў (напрыклад нафты), то сёння працуюць над біялагічнымі спосабамі «ўтылізацыі» складаных сумесяў, у тым ліку для ачысткі сцёкавых вод хімічных і перапрацоўчых вытворчасцяў. Інавацыйная распрацоўка Інстытута мікрабіялогіі — прэпарат «БіяСЭф», які забяспечвае ачыстку шматкампанентных водных раствораў і прадухіляе экалагічную шкоду ад выкідаў высокатаксічных злучэнняў, звярнуў увагу Аляксандр Шэпшалеў.

Яшчэ адна задача для мікрабіёлагаў — біяраскладальнае пакаванне. Сёння біятэхналогія створана, і цяпер, з улікам эканамічнай мэтазгоднасці, навукоўцы адпрацоўваюць пытанні прымянення такой упакоўкі ў розных галінах, расказаў дырэктар Інстытута мікрабіялогіі.

Сярод распрацовак беларускіх вучоных — лінейка прэпаратаў для аднаўлення дэградаваных глеб, расказала **Таццяна ПІЛІПЧУК, загадчыца лабараторыі малекулярнай дыягностыкі мікробацэнозаў тэхнагенных экасістэм ДНВА «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі».** Распрацавана і лінейка прэпаратаў для ачышчэння водных прастор. Сярод іх — «Біяпруд»: бактэрыі ў яго складзе пераводзяць адклады сажалак у засваяльную для рыб форму, тым самым чысцячы ваду, узбагачаючы рацыён рачных насельнікаў мінеральнымі рэчывамі і эфектыўна ўздзейнічаючы на патагены рыб.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

На слыху

# З ПОШТЫ Ў БАНК

## Нагадваем пра асноўныя змяненні па сацвыплатах з 1 ліпеня

**Сацыяльныя выплаты, якія дастаўляюцца праз пошту (у аддзяленні пошты альбо з дастаўкай дадому), з ліпеня будуць выплачвацца праз банк. Цягам гэтага тыдня яшчэ можна паспець аформіць базавы рахунак, на які вам будуць налічваць выплаты. Пры гэтым зусім неабавязкова заводзіць банкаўскую картку. Нагадваем асноўныя нюансы, якія зменяцца з наступнага месяца.**



### Пра якія сацвыплаты ідзе гаворка:

• пенсіі;

• дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей;

• дапамога па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

### У чым сутнасць змены?

Змяненні закрануць тых, хто пражывае ў Мінску, гарадах абласнога падпарадкавання і раённых цэнтрах:

• маладых пенсіянераў да 70 гадоў, якія не з'яўляюцца інвалідамі I і II групы;

• атрымальнікаў дзіцячых дапамог (за выключэннем інвалідаў I і II групы, а таксама сем'яў, якія выхоўваюць дзіця-інваліда да 18 гадоў);

• атрымальнікаў дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

— Прымаючы рашэнне на выплату праз банкі, у першую чаргу ўлічвалася даступнасць, таму змены закрануць менавіта жыхароў гарадоў і раённых цэнтраў, дзе маецца свая пашыраная банкаўская сетка, банкаматы і грошы можна атрымаць або наяўнымі, або праз залічэнні на картку. І, канешне, улічваліся катэгорыі: гэта мабільныя пенсіянеры, якія могуць дайсці да банкаў, — каментуе **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.**

### Алгарытм застанецца ранейшы

Раней па пенсію трэба было ісці на пошту і атрымліваць грошы наяўнымі, пасля разлічвацца імі ў магазіне ці за іншыя паслугі. Цяпер дастаткова прыйсці ў банк, напісаць заяву на пералічэнне сацыяльных выплат на банкаўскі рахунак.

— Тут сам грамадзянін выбірае, як ён будзе атрымліваць пенсію: штомесяц у банку, гэтак жа, як раней, на пошце, прад'яўляючы пашпарт, ці пры дапамозе банкаўскай карткі, якая дае больш свабоды. Калі ён выбірае хадзіць у банк, то алгарытм не мяняецца: раней хадзіў на пошту — цяпер будзе хадзіць у аддзяленне банка, — тлумачыць Валерый Кавалькоў.

### Каго змяненні не закрануць

• Атрымальнікаў пенсій (незалежна ад месца пражывання) ва ўзросце, старэйшым за 70 гадоў і інвалідаў I і II групы;

• атрымальнікаў дзіцячых дапамог (незалежна ад месца пражывання) з ліку інвалідаў I і II групы і сем'яў, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў;

• атрымальнікаў пенсій, дзіцячых дапамог, дапамогі па доглядзе, якія пражываюць у сельскай мясцовасці.

Гэтым катэгорыям па-ранейшаму дадзена права выбару атрымання сацвыплат: праз пошту (у касе пошты або з дастаўкай дадому) або банк (у касе банка або на банкаўскую картку).

### Як адкрыць базавы рахунак

Для атрымання пенсій і дапамог праз банк неабходна да 21 чэрвеня 2024 года:

1. Прыйсці ў банк з пашпартам або іншым дакументам, які сведчыць асобу, і адкрыць БАЗАВЫ рахунак. Да адкрытага рахунку можна бясплатна атрымаць банкаўскую плацежную картку. Яна будзе бясплатна абслугоўвацца і прымацца ва ўсіх арганізацыях гандлю і сэрвісу.

2. Запоўніць па ўзоры заяву аб пералічэнні сацвыплат у банк.

Яна будзе накіравана банкам у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. І самому грамадзяніну больш нікуды не трэба хадзіць.

— Мы павінны разумець, што парадак выплаты пенсіі змяняецца з 1 ліпеня. У нас ідзе цэнтралізаванае фарміраванне выплатных дакументаў і залічэнне грашовых сродкаў. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны разам са сваімі падведамаснымі органамі прыступае да гэтай працэдуры 25 чысла, таму каб усё карэктна сфарміравалася, пажадана падаць звесткі да 20-га. Тады банк на працягу трох дзён перашле заяву і інфармацыю ў органы сацыяльнай абароны і выплатныя дакументы сфарміруюцца карэктна. Калі заява пададзена не будзе, пенсію за ліпень мы, канешне ж, выплацім у індывідуальным парадку, пры гэтым гарантаваць, што грамадзянін атрымае яе ў звыклую для сябе дату, ніхто не можа. Ёсць нормы закона, якія ўсе павінны выконваць, — патлумачыў Валерый Кавалькоў.

### Спіс банкаў, у якіх можна адкрыць БАЗАВЫ рахунак:

«Беларусбанк», «Прыёрбанк», «Белаграпрамбанк», «Сбер Банк», «Белгазпрамбанк», «Белінвестбанк», «Банк Дабрабыт», «Белзнешэканамбанк».

Канкрэтны банк выбірае сам чалавек.

Выплату пенсій і дапамог праз пошту (у касе пошты ці з дастаўкай дадому) па ўсёй краіне будзе ажыццяўляць нацыянальны аператар паштовай сувязі РУП «Белпошта».

### Чаму ўнесены змяненні?

Яшчэ да змянення парадку выплаты пенсій больш за 70 % пенсіянераў атрымлівалі выплаты праз банкі, паколькі гэта больш звыклы спосаб.

— Банкаўскія карткі ўвайшлі ў наша жыццё даволі даўно, і сёння на пенсію выходзяць грамадзяне, якія прызвычаіліся да банкаўскіх картак, бо атрымлівалі такім чынам заработную плату. Фактычна для іх нічога не змяняецца, — каментуе Валерый Кавалькоў.

Намеснік міністра адзначае, што прычыны змяненняў дзве. Па-першае, гэта развіццё лічбавых тэхналогій і ўкараненне перадавых прадуктаў, па-другое, на выплату пенсій і дапамог праз РУП «Белпошту» выдаткоўвалася каля 100 мільёнаў рублёў. Банкі выплачваюць сацыяльныя дапамогі бясплатна. Гэтыя дадатковыя фінансавыя затраты будуць накіраваны на павелічэнне сацыяльных выплат.

Па пытаннях пераводу выплаты пенсій і дапамог праз банкі, а таксама праз пошту можна звяртацца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# НАКРЫЕ СПЯКОТА, А ПАСЛЯ ІСТОТНА ПАХАЛАДАЕ

## Сіноптыкі папярэджваюць аб моцных ліўнях, магчымы град

**Тэмпературнымі «арэлямі» нас ужо не спалохаеш, у красавіку — маі былі рэзкія перапады тэмператур. Але, каб за адзін дзень гублялася больш за 10 градусаў, а ноч — дзень — 22 градусы, гэта ўжо занадта. Апошнім часам такія перапады ў нас і вясной, і летам магчымы, лічаць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

У аўторак ноччу ўмовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць тылавая частка цыклону з цэнтрам над Еўрапейскай тэрыторыяй Расіі, а днём адаб'ецца ўплыў цёплай няўстойлівай паветранай масы. Пераменная воблачнасць. Ноччу месцамі, днём пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Вецер заходні слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы 12—18 градусаў, удзень — 24—29 цяпла. Атмасферны ціск ноччу і раніцай будзе расці, днём істотна не зменіцца.

Самы гарачы дзень на гэтым тыдні чакаецца ў сераду. У гэтыя суткі ноччу ў асноўным адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, а днём надвор'е будуць вызначаць актыўныя атмасферныя франты. Пераменная воблачнасць. Ноччу месцамі па паўднёвым захадзе, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы, у дзённыя гадзіны месцамі чакаюцца моцныя дажджы, магчымы град. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны, удзень парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 12 да 18 градусаў, а максімальная днём ад 23 да 30 градусаў, па поўдні краіны паветра прагрэецца да 32 цяпла.

А далей лета зробіць сабе «кароткачасовы адпачынак». У чацвер ноччу яшчэ захаваецца ўплыў актыўнай франтальнай сістэмы, а днём умовы надвор'я будзе фарміраваць няўстойлівая паветраная маса паўночна-заходняга паходжання. Ноччу воблачна з праясненнямі, днём пераменная воблачнасць. Ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер заходняй чвэрці парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы знізіцца мінімальна да 10—17 цяпла, максімальная днём будзе ад 17 да 23 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу надвор'е возьме яшчэ паўзу. Будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Паветра прагрэецца да плюс 19—26 градусаў.

У суботу ноччу надвор'е будзе пераважна без ападкаў, днём месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Гэты дзень будзе пад знакам кантрасных тэмператур. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да плюс 16 градусаў. Днём прагназуецца 19—25 градусаў, а па поўдні — 29 цяпла.

У нядзелю тэрыторыю нашай краіны ў суправаджэнні новай порцыі дажджоў і лакальных навальніц будзе перасякаць чарговы атмасферны фронт, які не толькі папоўніць чэрвеньскую скарбонку ападкаў, але і крыху панізіць тэмпературу. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі згусціцца слабы туман. Уначы слупкі тэрмометра пакажуць ад плюс 8 градусаў па паўночным усходзе да плюс 19 градусаў па поўдні. Удзень чакаецца 18—25 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**


## Извещение о проведении 19 июля 2024 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-113573 общей площадью 1181,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения. Обременение: аренда (23,1 кв. м – по 31.03.2025; 250 кв. м – по 31.12.2024) | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 342 088,78 | 34 200,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144 общей площадью 1212,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А/6, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 284 232,67 | 28 400,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 420/С-5927 общей площадью 232,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Железнодорожная, д. 16, наименование – здание конторы, назначение – здание административно-хозяйственное | Площадь – 0,0992 га, кадастровый номер – 441300000011000456 | 132 797,23 | 13 200,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 420/С-33082 общей площадью 1066,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38А, наименование – магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-33277* общей площадью 138,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38, наименование – магазин № 51, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-5931 общей площадью 92,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 4, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 420/С-46997 общей площадью 164,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, д. 2, наименование – магазин № 52, назначение – здание специализированное розничной торговли. * Обременение: аренда по 07.09.2026 | Площадь – 0,3387 га, кадастровый номер – 441300000010000096 | 1 335 738,24 | 133 500,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023 | 3 408,00 | 340,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д. 81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли; отопительный котел «Тисом» с инв. номером по бух. учету 080840 | Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184 | 4 222,00 | 420,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. номером 413/С-528 общей площадью 48,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12, наименование – автостанция, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; капитальное строение с инв. номером 413/С-529 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12/1, наименование – сарай, назначение – здание нежилое | Площадь – 0,0446 га, кадастровый номер – 425255700001000037 | 2 514,00 | 250,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение** с инв. номером по бух. учету 084792 общей площадью 22,0 кв.м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | Одна базовая величина | Одна базовая величина |
| 9 | Капитальное строение с инв. номером 410/С-27187 общей площадью 444,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/1, склад, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 410/С-26719 общей площадью 75,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1/2, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 410/С-26718 общей площадью 25,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Новые Борки, 1, наименование – контора склада, назначение – здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда по 31.12.2024 (размещение антенны и контейнера сотовой связи 36 кв. м) | Площадь – 0,2813 га, кадастровый номер – 420850100001006901 | 17 136,00 | 1 700,00 |

** Согласно пункту 2 положения о порядке распоряжения неиспользуемым имуществом хозяйственных обществ, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом», продажа неиспользуемого имущества на торгах (на аукционе или по конкурсу) либо без проведения торгов может осуществляться в том числе без наличия документов, удостоверяющих государственную регистрацию его создания, возникновения прав, ограничений (обременений) прав на него

Продаваемое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации. Рекомендуется проведение осмотра

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 19.07.2024 по предмету торгов №_.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **19 июля 2024 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.06.2024 по 17.07.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

## ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена (в бел. руб., эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| 17.07.2024 09-00 | Продажа участка с кадастр. № 623685200002000119, по адресу: Минская обл., Минский р-н, СТ «ОПТИК-УЗБОРЬЕ» | 6000 | 0,436 га | 10 | 90 |
| 17.07.2024 10-00 | Продажа многофункционального комплекса с инв. № 600/С-147470, по адресу: Минская обл.. Минский р-н, Папернянский с/с, д. Приморье, ул. Центральная, 5В | 1 500 000 | 1329,2 кв. м | 10 | 90 |
| 17.07.2024 11-00 | Продажа квартиры с инв. б/н, по адресу: г. Минск, ул. Аэродромная, 1В-201 | 69 900 | 47,64 кв. м | 10 | 90 |
| 17.07.2024 13-00 | Продажа квартиры с инв. № 614/D-23210, по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Молодежная, д. 2, кв. 3 | 37 000 | 53 кв. м | 10 | 90 |
| повторные конкурсные торги | | | | | |
| 17.07.2024 12-00 | Продажа дома с инв. № 600/С-64, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, д. Волковичи, ул. Ружанская, д. 4 | 299 999 | 592,7 кв. м | 10 | 90 |
| 17.07.2024 14-00 | Продажа дома с инв.№ 500/С-33313, по адресу: г. Минск, пер. Радиаторный 1-й, д. 19 | 399 900 | 327,9 кв. м | 10 | 90 |
| 17.07.2024 15-00 | Продажа участка с кадастр. № 625800000001000564, по адресу: Минская обл., Червенский р-н, СТ «Вересок», д. 182 | 5400 | 0,1008 га | 10 | 90 |
| 17.07.2024 16-00 | Продажа квартиры с инв. № 644/D-1746, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Козлова, д. 44, кв. 1 | 47 000 | 49,1 кв. м | 10 | 90 |
| 17.07.2024 17-00 | Продажа кабинета с инв. № 500/D-798823614, по адресу: г. Минск, ул. Якубова, 10-15а | 21 900 | 28,4 кв. м | 10 | 90 |
| 17.07.2024 18-00 | Продажа дома с инв. № 620/С-46411, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Негорельский с/с, д. Мостище, ул. Центральная, 56А | 84 900 | 96,1 кв. м | 10 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск. ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22.

Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529) 171-50-50

УНП 193734126

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Двухкомнатная квартира** (**52,5 кв. м,** инв. № 122/D-6960, в состав квартиры входит кладовая в подвале).
Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. В. Клютко, 35-23**

**Начальная цена лота (без НДС) – 66 904,47 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**
**Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік — унікальны музейны комплекс амаль з шасцідзесяцігадовай гісторыяй, аналагаў якому няма ў краіне. Па выніках мінулага года ўстанова пацвердзіла статус нацыянальнай, што з'яўляецца яшчэ адным паказчыкам высокага прафесіяналізму яе вялікага калектыву. Аб тым, чым запаведнік жыве сёння і якія незвычайныя экспанаты захоўваюць філіялы ўстановы, расказала дырэктар НПГКМЗ Марына ЧАРНЫШОВА.**

***— Марына Валер'еўна, пазнаёмце нашых чытачоў са структурай запаведніка і музеямі, якія ўваходзяць у яго склад.***

— На сёння Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік з'яўляецца навукова-даследчай і асветнай установай культуры. Гэта ўнікальная гістарычная тэрыторыя, гістарычныя, археалагічныя, архітэктурныя помнікі якой ахоўваюцца, вывучаюцца, рэстаўрыруюцца і прыстасоўваюцца пад музейныя экспазіцыі. У структуру музея-запаведніка ўваходзяць 11 музеяў і гісторыка-культурны комплекс «Поле ратнай славы» ў вёсцы Гомель Полацкага раёна, прысвечаны гісторыі Полацкага ўмацаванага раёна.

Безумоўна, асаблівай папулярнасцю ў наведвальнікаў карыстаецца Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора. Гэта галаўны музей запаведніка, які размяшчаецца ў Сафійскім саборы — помніку архітэктуры XI—XVIII стагоддзяў, ён і з'яўляецца цэнтральным экспанатам. Размешчаны на тэрыторыі Верхняга замка сабор з'яўляецца першай каменнай пабудовай на тэрыторыі Беларусі і мае сусветную каштоўнасць. Экспанаты музея расказваюць пра гісторыю архітэктуры самага старога будынка ў краіне, яго шматлікія рамонты, перабудовы і апошнюю рэстаўрацыю помніка. У Сафійскім саборы можна ўбачыць фрагменты мура XI стагоддзя, цалкам захаваны падмурак і фрэскавыя роспісы канца XI стагоддзя.

Асаблівасць музея яшчэ і ў тым, што ён адначасова з'яўляецца і канцэртнай залай камернай музыкі. У 1985 годзе па спецзамове чэшская фірма вырабіла для полацкай Сафіі арган, які, безумоўна, прызнаны музычнай грамадскасцю найлепшым канцэртным інструментам у Беларусі. Такім чынам, Сафійскі сабор — вельмі значны і прыцягальны культурны аб'ект як для палачан, так і для шматлікіх гасцей, візітная картка старажытнага горада.

Унікальная гістарычная тэрыторыя павінна мець такія месцы, дзе б жыхары і госці горада змаглі адчуць подых гісторыі. Найстарэйшы музей — краязнаўчы — праз два гады будзе адзначаць 100-гадовы юбілей. Экспазіцыя распавядае пра Полацк як сталіцу старажытнага ўсходнеславянскага княства — калыску беларускай дзяржаўнасці, цэнтр культуры і духоўнасці.

Большасць музеяў і будынак адміністрацыі знаходзяцца на адной з самых старажытных вуліц горада — Ніжне-Пакроўскай. Стацыянарная выстава «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай», якая размяшчаецца ў доміку Пятра І, прыцягвае вялікую колькасць наведвальнікаў. І нездарма, бо экспазіцыя з'яўляецца адзінай у Беларусі, якая прысвечана гісторыі адной вуліцы ў пэўны адрэзак часу. Яна была створана ў сувязі з перанясеннем мошчаў прападобнай Ефрасінні Полацкай з Кіева ў 1910 годзе.

Экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання і Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага прысвечаны гісторыі беларускай кнігі, дакніжным і кніжным формам пісьменства, тэхнікам кніжнай ілюстрацыі, а таксама жыццю і дзейнасці выдатных асветнікаў Полацкай зямлі.

Мастацкая галерэя размяшчаецца ў адным з карпусоў былога езуіцкага калегіума. Пастаянная экспазіцыя галерэі знаёміць з развіццём выяўленчага мастацтва Беларусі, пачынаючы з выставы «Сценапіс XII—XIX стагоддзяў Спаса-Праабражэнскага храма». Гэтая ўнікальная выстава знятага са сцен храма алейнага жывапісу не мае аналагаў у нашай краіне. Яна створана дзякуючы гранту фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва і з'яўляецца вынікам шматгадовай працы навукоўцаў, рэстаўратараў і музейных супрацоўнікаў.

Адзіны ў Беларусі дзіцячы музей — гэта свайго роду машына часу, дзякуючы якой можна адправіцца ў займальнае падарожжа па свеце звыклых рэчаў, перанесціся ў мінулае, зразумець, што чалавек па сваёй сутнасці — творца і вынаходнік.

Прыродна-экалагічны музей размешчаны ў былой воданапорнай вежы, незвычайная архітэктура якой як нельга лепш падышла для рэалізацыі творчай задумы аўтараў экспазіцыі. Цэнтральная лесвіца музея сімвалізуе дрэва жыцця. Падымаючыся ўверх, можна трапіць у свет унікальнай беларускай прыроды, сучаснага горада з яго экалагічнымі праблемамі, у запаведны свет, дзе прырода беражліва ахоўваецца.

Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я адкрывае наведвальнікам сакрэты вырошчвання і апрацоўкі лёну ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў на тэрыторыі паўночнай Беларусі, расказвае аб самым распаўсюджаным і старажытным відзе народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — ткацтве.

Музей баявой славы, Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобавай-Марчанкі і гісторыка-культурны комплекс «Поле ратнай славы» захоўваюць памяць аб гісторыі Полацка і лёсах палачан у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Аб унікальнасці ды індывідуальнасці полацкіх музеяў можна расказваць вельмі доўга, але лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць.

***— Колькі экскурсантаў за год наведваюць музеі?***

— Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік з'яўляецца важным суб'ектам у развіцці гісторыка-культурнага турызму. Запаведнік свядома і планамерна працуе ў гэтым кірунку. Штогод музеі прымаюць больш за 220 тысяч наведвальнікаў. Неабходны складнік сучаснага музея — яго шырокая інфраструктура, каб зрабіць наведванне камфортным і зручным. Так, у Музеі беларускага кнігадрукавання адкрыта сувенірная крама, кавярня-бар. У Мастацкай галерэі наведвальнікі могуць завітаць у салон і набыць творы беларускіх мастакоў розных кірункаў: ад рэалізму да абстракцыі.

***— Якія ўнікальныя і незвычайныя экспанаты захоўваюцца ў калекцыях музея-запаведніка?***

— На сёння фонды запаведніка налічваюць больш за 110 тысяч адзінак захоўвання. Увесь музейны фонд размеркаваны па калекцыях, якіх звыш 35. Самымі шматлікімі з'яўляюцца калекцыі нумізматыкі, археалогіі, фотаматэрыялаў і друкаваных выданняў. Штогод збор папаўняецца прыкладна на 2,5 тысячы новых паступленняў. На старонках нашага афіцыйнага сайта polotsk.museum.by знаёмім наведвальнікаў з найбольш цікавымі паступленнямі, нават яшчэ да таго, як гэтыя прадметы апынуцца ў экспазіцыях музеяў.

Шэраг музейных прадметаў са збору запаведніка ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь: клад залатых ювелірных вырабаў, Казьянкаўскі манетны скарб куфічных дырхамаў, старадрукаваныя і рукапісныя кнігі. У экспазіцыі краязнаўчага музея знаходзіцца меч X стагоддзя з імянным таўром Ulfberht, які быў знойдзены ў 1956 годзе ў Полацку падчас будаўніцтва швейнай фабрыкі. У экспазіцыі мастацкай галерэі можна ўбачыць нагрудны абразок «Канстанцін і Алена» XII стагоддзя, знойдзены ў 1967 годзе на тэрыторыі Верхняга замка. Артэфакт сведчыць аб гандлёвых і палітычных сувязях Полацка з Візантыяй у XII—XIII стагоддзях. У Музеі беларускага кнігадрукавання знаходзіцца актавая пячатка Ефрасінні Полацкай.



Фота з адкрытых крыніц.

***— Марына Валер'еўна, у ліпені споўніцца два гады, як вы кіруеце самай буйной у краіне музейнай установай. Якія змены зведаў запаведнік за гэты час?***

— З 2022 года зачынены на рамонт Музей баявой славы, падыходзіць да завяршэння поўная мадэрнізацыя будынка і ўсіх яго сістэм. Плануем, што да 2025 года мерапрыемствы па святкаванні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне пройдуць ужо ў абноўленых экспазіцыйных залах. Таксама мы актыўна працуем над стварэннем яшчэ аднаго музея — археалогіі. У 2020 годзе музею-запаведніку быў перададзены будынак былога францысканскага кляштара — помніка архітэктуры XVIII стагоддзя. У дадзены момант вядзецца работа па стварэнні канцэпцыі музея і падрыхтоўка ўсёй навуковай дакументацыі. Калекцыя археалогіі ў фондах музея-запаведніка налічвае больш як 30 тысяч адзінак захоўвання. Нам ёсць што паказаць у будучым музеі і пра што расказаць нашым наведвальнікам.

Адным словам, запаведнік развіваецца: новыя праекты, выставы ў музеях, конкурсы, поўныя залы слухачоў на канцэртах міжнародных фестываляў у Сафійскім саборы — гэта вынік карпатлівай працы ўсяго калектыву музея-запаведніка, загадчыкаў філіялаў і ўсёй каманды супрацоўнікаў. Наперадзе шмат планаў і ідэй, якія хочацца рэалізаваць.

***— Музей-запаведнік разам з Віцебскам і Наваполацкам будзе прымаць удзельнікаў XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Раскажыце, якія аб'екты рыхтуюцца да гэтай падзеі і якую культурна-асветніцкую праграму прапануюць гасцям?***

— У рамках правядзення міжнароднага форуму ў Полацку будуць задзейнічаны Музей беларускага кнігадрукавання, на пляцоўцы якога пройдзе секцыя «Культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва і развіццё турызму як фактар умацавання ўзаемадзеяння рэгіёнаў Беларусі і Расіі». І, вядома, Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора і канцэртная зала будуць задзейнічаны ў рамках культурнай праграмы для гасцей. На гэтых аб'ектах вяліся ўнутраныя і вонкавыя рамонтныя работы, была добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя.

Суправаджаць удзельнікаў форуму будуць вопытныя экскурсаводы, якія раскажуць гасцям пра самы старажытны горад Беларусі. Для ўдзельнікаў дзявятай секцыі пройдуць экскурсіі ў Музеі беларускага кнігадрукавання, у Музеі-бібліятэцы Сімяона Полацкага і ў Сафійскім саборы. На астатніх аб'ектах у рамках форуму будуць устаноўлены інфакіёскі з інфармацыяй аб полацкіх музеях.

У 2023 годзе доследным у Полацку аб'ектам стаў стадыён «Спартак», які знаходзіцца на тэрыторыі Ніжняга замка. Археолагамі знойдзены цэлы квартал, дзе ў XI стагоддзі маглі пражываць майстры-ювеліры. Самыя цікавыя знаходкі будуць прадстаўлены ў Сафійскім саборы ў рамках форуму.

***— Чым сёння ганарыцца Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік?***

— Тым, што на сёння НПГКМЗ — найбуйнейшае музейнае аб'яднанне ў нашай краіне. За 57 гадоў існавання мянялася структура і назва ўстановы, але засталася нязменнай місія яе супрацоўнікаў — збіраць, захоўваць, вывучаць і прэзентаваць гісторыка-культурную спадчыну. Сёння ў запаведніку працуе творчы калектыў, згуртаваны агульнымі ідэямі і задачамі.

У 2022 годзе НПГКМЗ стаў дыпламантам XXI Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь» у намінацыі «Музей года», летась музей-запаведнік пацвердзіў статус нацыянальнага. Мы ганарымся нашай сучаснасцю.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# ІЎЕ І ВАКОЛІЦЫ

**Іўе — цікавая гродзенская старонка. Тут сыходзяцца не толькі гістарычныя шляхі, але і культуры розных народаў, якім у Беларусі заўжды было прывольна і ўтульна.**

Некалі паселішча з'яўлялася цэнтрам беларускага арыянства. Забыты сёння рэлігійны рух, сэнс каторага заключаецца ў роўнасці Хрыста з Богам-бацькам. Арыянства прытрымліваліся і простыя гараджане, і частка святароў. Але епіскапы ў большасці сваёй варожа ставіліся да цячэння, асуджанага яшчэ ў 325 годзе. У XVI стагоддзі інтарэсы арыянства адрадзіліся сярод рэфарматаў. І, як усялякая ерась, садзейнічалі развіццю навукі, асветы.

Дзякуючы новаму вітку ў лёсе арыянства, у Іўі былі адчынены друкарня і школа. Кнігі прыўнеслі ў гістарычную прастору навізну, прымусілі, няхай сабе і невялікую частку грамадства, мысліць, разважаць над рэчаіснасцю. Нават у тым выпадку, калі ў выдадзеных у Іўі фаліянтах было нямала супярэчнасцяў, усё адно яны вымушалі ісці наперад, рухалі час да новых змен. З думкамі пра плённасць дзейнасці розных ерацікоў і выпраўляемся ў падарожжа па Іўі і ваколіцах. Зазірнём у касцёл, які першапачаткова быў выбудаваны тут у 1600 годзе Станіславам Кішкам. Былі, праўда, пасля і пераабсталяванні, рэканструкцыі. У цэнтры горада — драўляная мячэць. Нараджэннем яна з 1844 года. Дарэчы, варта нагадаць, што Іўе здаўна лічылася цэнтрам беларускіх татар.

Але ж мы шукаем славутых землякоў, тыя зоркі — знічкі, што будуць і праз стагоддзі ўпрыгожваць гістарычную памяць пра гэты край. Упрыгожваць сваімі лёсамі, справамі і здабыткамі. У 1863 годзе ў Іўі нарадзіўся Хаім Озер Гродзінскі, вядомы яўрэйскі грамадскі і рэлігійны дзеяч Польшчы ў міжваенны перыяд. Між іншым, напрыканцы XIX стагоддзя ў Іўі было тры сінагогі. У 15 гадоў Хаім пачаў вучыцца ў валожынскай яўрэйскай іешыве. Сярод яго настаўнікаў — вядомы рэлігійны дзеяч Хаім Салавейчык. У 1885 годзе малады чалавек заняў месца віленскага рабіна.

Трабы — адно са старажытных паселішчаў Іўеўскага краю, Гродзеншчыны. Тут у 1894 годзе нарадзіўся Пётр Якаўлевіч Юргелевіч. Не дзіўна, што галоўным клопатам свайго жыцця ён выбраў вывучэнне беларускай мовы. У Трабах жыццё заўжды віравала. Працавалі з дзясятак крам, чатыры разы на год ладзіліся кірмашы. Сюды ішоў, ехаў, спяшаўся са сваімі клопатамі розны люд. І кожны — са сваім слоўцам. Пётр Юргелевіч скончыў факультэт грамадскіх навук Белдзяржуніверсітэта. У 1927—1928 гг. працаваў адказным рэдактарам газеты «Наш працаўнік» у Клімавічах, на Магілёўшчыне. Затым вярнуўся ў Мінск. Спярша працаваў стыльрэдактарам у Белдзяржвыдавецтве. Пасля — вучоным сакратаром Інстытута мовазнаўства АН БССР. У сакавіку 1936-га трапіў пад каток рэпрэсій. Да 1940 года знаходзіўся ў папраўча-працоўным лагеры. А душа прагнула заняткаў роднай мовай, тым больш што і падмурак быў ужо закладзены... Разам з іншымі навукоўцамі Пётр Якаўлевіч падрыхтаваў «Анкету для збірання матэрыялаў па беларускай мове» (1931), браў удзел у падрыхтоўцы «Праекта спрашчэння беларускага правапісу» (1933), «Ваеннага руска-беларускага слоўніка» (1933), падручніка «Беларуская граматыка: Марфалогія» (1936). Вярнуўшыся з лагера, у 1944—1969 гг. ураджэнец Трабаў згадаў ранейшыя навуковыя набыткі, загадваў кафедрай беларускай мовы Магілёўскага педінстытута. У 1958 годзе выдаў грунтоўны «Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі». А праз некаторы час — «Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі». І хоць Юргелевіч так і не абараніў дысертацыі, не атрымаў навуковай ступені кандыдата і доктара навук, яго навуковыя даследаванні, метадычныя дапаможнікі — і сёння крыніца вялікага досведу для ўсіх, хто грунтоўна займаецца вывучэннем беларускай мовы. Памёр Пётр Якаўлевіч 17 красавіка 1973 года на 80-м годзе жыцця.



Вельмі рэдка ў Беларусі згадваецца імя ўраджэнца вёскі Цэпеняты Іўеўскага раёна Івана Паўлавіча Дабейкі. Нарадзіўся ён у жніўні 1942 года. Рамантыка паклікала ў далёкую ад Гродзеншчыны старонку. У 1965 годзе хлопец закончыў Днепрапятроўскі горны інстытут і паехаў на Поўнач. Працоўную біяграфію пачаў старшым тэхнікам-геолагам Архангельскай комплекснай геалагічнай экспедыцыі. Прайшоўшы выпрабаванне і пасадамі, і справамі, Іван Паўлавіч быў прызначаны кіраўніком Юраўскай геолагаразведвальнай экспедыцыі (1977). І займаў гэтую пасаду больш за 16 гадоў. Пад кіраўніцтвам нашага земляка былі разведаны сховішчы алмазаў, каштоўных будаўнічых матэрыялаў і падземных водаў. З 1992 да 1998 года Дабейка працаваў начальнікам Паўночнага камітэта па геалогіі і выкарыстанні нетраў Міністэрства прыродных рэсурсаў Расійскай Федэрацыі. Менавіта ў гэты час архангельскімі геолагамі было зроблена выдатнае адкрыццё — знойдзена высокаалмазная трубка імя В. Грыба. Пасля І. Дабейка працаваў у Галоўным упраўленні прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Міністэрства прыродных рэсурсаў Расійскай Федэрацыі па Калужскай вобласці. Івану Паўлавічу было даручана стварэнне службы дзяржаўнага кантролю. Праца нашага земляка адзначана Дзяржаўнай прэміяй СССР, званнем заслужанага геолага Расійскай Федэрацыі. А яшчэ І. Дабейку ўганаравалі званнем Першаадкрывальніка месцанараджэння алмазаў імя М. В. Ламаносава. Такая адзнака дарагога варта. Памёр Іван Паўлавіч у 2003 годзе.

Адно з найцікавейшых паселішчаў у Іўеўскім краі — Геранёны. Тут яшчэ ў XV — на пачатку XVI стагоддзя быў пабудаваны абарончы замак. Да нашых дзён засталіся толькі руіны. Ужо і Напалеон Орда, замалёўваючы Беларусь гістарычную, спаткаў тут у XIX стагоддзі адны развалiны. Іх і занатаваў. У альбоме вядомага графіка малюнак суправаджаецца тэкстам: «...Згодна са старажытнымі хронікамі, Геранёны былі падараваны вялікім князем Эрдзівілам военачальніку Грумпю, сын якога Гаштольд стаў заснавальнікам роду Гаштольдаў, зніклага ў 1542 годзе. Тут у 1538 годзе жыла Барбара Радзівіл, будучая жонка Станіслава Гаштольда. Зараз — уладанне Мілеўскіх». Напалеон Орда аказаўся нешматслоўным. Ды і задача ў яго была іншая... А Барбара Радзівіл — яшчэ і каралева польская, другая жонка Жыгімонта II Аўгуста, адзін з найярчэйшых персанажаў не толькі гістарычных мемуараў, але і мастацкай літаратуры на працягу многіх стагоддзяў. Можна не зазіраць у зборы даўніх фаліянтаў, а толькі на старонкі драматычнай паэмы нашай сучасніцы Раісы Баравіковай «Барбара Радзівіл», каб зразумець характар жыцця славутай зямлячкі... Праўда, Геранёны прысутнічаюць там толькі раз. Брат Барбары Мікалай Руды Радзівіл, каб суняць рамантычны пыл кахання, раіць сястры: «Мо паедзь у Геранёны? // Хай будзе Аўгуст цалкам адлучоны!..»

Былі яшчэ і Геранёны Манівідавы — сённяшнія Суботнікі. І ім пашчасціла на гістарычныя летапісы. У прыватнасці, у Суботніках нарадзіўся аўтар кнігі «Мае Суботнікі» — краязнаўца і пісьменнік Казімір Нехвядовіч.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**
**Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**

Фестывалім

# У ГОНАР ФЁДАРА МАХНОВА

## У аграгарадку Ноўка Віцебскага раёна абласны фестываль «Волаты Прыдзвіння» трэці раз сабраў сотні цыркавых і вулічных артыстаў

**Сёння імя віцебскага Гулівера, аднаго з самых папулярных людзей XX стагоддзя Фёдара Махнова, вядома многім, асабліва жыхарам паўночнага рэгіёна. Гэта легендарная асоба праславілася на ўвесь свет не толькі самым высокім ростам (285 сантыметраў), але і надзвычайнай сілай, прафесіяналізмам і вясковай сціпласцю. У біяграфіі Махнова, які нарадзіўся і потым жыў у вёсцы Касцюкі, што ў Віцебскім раёне, вялікі цыркавы вопыт, сустрэчы з Папам Рымскім і англійскай каралевай, работа на млыне пасля вяртання на радзіму. У гонар земляка, імя якога стала брэндам Віцебскага раёна, шэсць гадоў таму арганізавалі фэст вулічнага і цыркавога мастацтва, а тры гады таму ён вырас да абласнога маштабу. Сёлета свята сабрала больш за паўтары тысячы гасцей і ўдзельнікаў з розных куткоў вобласці і з Расіі.**



Штогод арганізатары фестывалю імкнуцца прыдумаць такія цікавінкі, якія маглі б увайсці ў гісторыю не толькі раёна, але і краіны. Так, сёлета ў рамках фэсту адбыўся першы ў Беларусі забег роставых лялек. Увогуле, арганізатары падрыхтавалі для гасцей свята каля 30 розных мерапрыемстваў для самых маленькіх і самых дарослых удзельнікаў, стадыён у Ноўцы літаральна пераўтварыўся ў адзін каляровы гарадок са сваімі вулачкамі. Тут прайшлі адкрыты конкурс паветраных змеяў, выстава арт-аб'ектаў «Парк веліканаў і мініяцюр», лагер гістарычна-ролевай гульні, адкрыты сямейны чэмпіянат. Асабліва спадабаўся гасцям ужо традыцыйны конкурс сярод сабак і іх гаспадароў «Хвосцік-шоу». У лаўнж-зоне ўсе ахвотныя змаглі паспрабаваць сябе ў стаянні на цвіках, а сувеніры і памятныя падарункі, выробленыя педагогамі і навучэнцамі Цэнтра дзяцей і моладзі, можна было набыць у «Лаўцы цудаў».

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Марына НАВІЦКАЯ** адзначыла, што Ноўка — яе малая радзіма, таму прысутнічаць на свяце ёй прыемна ўдвая. «Вялікую радасць выклікае той факт, што невялікія гарады і населеныя пункты знаходзяць свае адметнасці і брэнды, якія папулярызуюць праз фестывалі і святы. Тут заўсёды можна атрымаць зарад яркіх эмоцый, знайсці занятак па душы», — падкрэсліла яна.



**Старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар ДАРОЖКІН** расказаў, што для таго, каб фэст «Волаты Прыдзвіння» выйшаў на абласны ўзровень, усе арганізацыі і ўстановы раёна прыклалі нямала сіл, творчасці і навыкаў. «Гэты фестываль ужо заняў сваю нішу ў краіне, аб ім ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за межамі. А гэта значыць, што мэта арганізатараў зрабіць ураджэнца Прыдзвіння Фёдара Махнова брэндам не толькі раёна, але і вобласці, дасягнута», — адзначыў Віктар Васільевіч.

Не першы год на свята пад Віцебскам прыязджаюць родзічы Махнова, сёлета праўнучка велікана Галіна Шчацілава прыехала разам з сынам і нявесткай з Масквы. Жанчына падзялілася, што нашчадкам Фёдара Андрэевіча вельмі прыемна, што памяць аб ім беражліва захоўваюць і папулярызуюць на Віцебшчыне, удвая радасна, што такое вялікае свята штогод праходзіць у гонар Махнова. Дарэчы, рост пад тры метры не атрымаў у спадчыну ніхто з унукаў і праўнукаў віцебскага Гулівера.

Святочным акордам вечара сталі мотапрабег, вогненнае прадстаўленне і начная дыскатэка, а перад гэтым на галоўнай сцэне фестывалю адбыўся рок-канцэрт.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота ТК «Витебский район. Официально».**

# ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

**Годовая консолидированная финансовая отчетность в соответствии с МСФО в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb.by.** УНП 101165625

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ на 31 декабря 2023 года ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| | Прим. | 2023 год | 2022 год (реклассифицировано) |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 6 | 450 836 | 301 763 |
| Средства в кредитных организациях | 7 | 130 740 | 101 552 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 8 | 190 576 | 172 108 |
| Производные финансовые активы | 9 | 205 | 236 |
| Кредиты клиентам | 10 | 1 679 748 | 1 271 776 |
| Активы, предназначенные для продажи | 11 | 5 740 | 1 419 |
| Основные средства | 12 | 73 518 | 73 110 |
| Нематериальные активы | 13 | 37 760 | 28 274 |
| Предоплаты по налогу на прибыль | | - | 7 191 |
| Прочие активы | 16 | 22 455 | 20 945 |
| **Итого активы** | | **2 591 578** | **1 978 374** |
| **Обязательства** | | | |
| Средства кредитных организаций | 17 | 194 273 | 185 177 |
| Производные финансовые обязательств | 9 | 795 | 1 383 |
| Средства клиентов | 18 | 1 619 459 | 1 127 829 |
| Обязательства по договорам аренды | | 4 477 | 3 462 |
| Прочие резервы | 21 | 2 969 | 2 435 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 14 | 44 128 | 34 759 |
| Обязательства по налогу на прибыль | | 3 979 | - |
| Прочие обязательства | 16 | 14 719 | 11 737 |
| Субординированные займы | 19 | 16 682 | 17 979 |
| **Итого обязательства** | | **1 901 481** | **1 384 761** |
| **Собственный капитал** | 20 | | |
| Уставный капитал | | 166 699 | 166 699 |
| Эмиссионный доход | | 19 256 | 19 256 |
| Нераспределенная прибыль | | 494 454 | 397 676 |
| Фонд переоценки основных средств | | 9 688 | 9 982 |
| **Итого собственный капитал** | | **690 097** | **593 613** |
| **Итого собственный капитал и обязательства** | | **2 591 578** | **1 978 374** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКЕ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| | Прим. | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|
| Процентная выручка, рассчитанная с использованием эффективной процентной ставки | 22 | 263 031 | 277 461 |
| Процентные расходы | 22 | (93 056) | (131 492) |
| **Чистый процентный доход** | | **169 975** | **145 969** |
| Расходы по кредитным убыткам | 15 | (10 059) | (37 847) |
| **Чистый процентный доход после расходов по кредитным убыткам** | | **159 916** | **108 122** |
| **Чистые комиссионные доходы** | **23** | **19 582** | **18 556** |
| Чистые прибыли/(убытки) по операциям с иностранной валютой: | | | |
| - торговые операции | | 15 613 | 144 383 |
| - переоценка валютных статей | | 23 700 | (34 922) |
| Чистые доходы от прекращения признания финансовых активов по амортизированной стоимости | 10 | 277 | - |
| Доходы от восстановления прочих резервов | 15 | 438 | 341 |
| Прочие доходы | 24 | 11 845 | 10 819 |
| **Непроцентные доходы** | | **71 455** | **139 177** |
| Расходы на персонал | 25 | (62 087) | (55 829) |
| Амортизация | 12, 13 | (11 761) | (10 026) |
| Прочие операционные расходы | 25 | (30 923) | (28 879) |
| Налоги кроме налога на прибыль | 25 | (595) | (1 121) |
| **Непроцентные расходы** | | **(105 366)** | **(95 855)** |
| **Прибыль до расходов по налогу на прибыль** | | **126 005** | **151 444** |
| Расходы по налогу на прибыль | 14 | (29 521) | (34 455) |
| **Прибыль за год** | | **96 484** | **116 989** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В СОБСТВЕННОМ КАПИТАЛЕ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| | Приходится на акционеров Банка | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Уставный капитал | Эмиссионный доход | Нераспределенная прибыль | Фонд переоценки основных средств | Итого капитал |
| **На 1 января 2022 г.** | **166 699** | **19 256** | **280 509** | **13 053** | **479 517** |
| Прибыль за год | – | – | 116 989 | – | 116 989 |
| Прочий совокупный доход за год | – | – | – | (2 893) | **(2 893)** |
| **Итого совокупный доход за год** | **–** | **–** | **116 989** | **(2 893)** | **114 096** |
| Амортизация фонда переоценки основных средств | – | – | 178 | (178) | – |
| **На 31 декабря 2022 г.** | **166 699** | **19 256** | **397 676** | **9 982** | **593 613** |
| Прибыль за год | – | – | 96 484 | – | **96 484** |
| Прочий совокупный расход за год | – | – | – | – | – |
| **Итого совокупный доход за год** | **–** | **–** | **96 484** | **–** | **96 484** |
| Амортизация фонда переоценки основных средств | – | – | 294 | (294) | – |
| **На 31 декабря 2023 г.** | **166 699** | **19 256** | **494 454** | **9 688** | **690 097** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|
| Прибыль за год | **96 484** | **116 989** |
| **Прочий совокупный доход** | | |
| *Прочий совокупный доход, не подлежащий реклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах* | | |
| Переоценка/(обесценение) зданий | - | (2 893) |
| **Итого прочий совокупный доход/(расход), не подлежащий реклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах** | **-** | **(2 893)** |
| **Итого совокупный доход за год** | **96 484** | **114 096** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за год, закончившийся 31 декабря 2023 года ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| | Прим. | 2023 год | 2022 год (реклассифицировано) |
|---|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | | |
| Проценты полученные | | 259 103 | 266 126 |
| Проценты выплаченные | | (91 102) | (132 193) |
| Комиссии полученные | | 28 679 | 27 797 |
| Комиссии выплаченные | | (8 695) | (9 500) |
| Реализованные доходы за вычетом расходов по операциям с иностранной валютой | | 15 056 | 145 572 |
| Прочие доходы полученные | | 13 020 | 10 463 |
| Расходы на персонал и прочие операционные расходы, выплаченные | | (92 186) | (83 363) |
| **Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах** | | **123 875** | **224 902** |
| *Чистое (увеличение)/уменьшение операционных активов* | | | |
| Средства в кредитных организациях | | (28 334) | 66 663 |
| Инвестиционные ценные бумаги | | 8 697 | 8 543 |
| Кредиты клиентам | | (410 687) | 3 748 |
| Прочие активы | | (141) | (4 498) |
| *Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств* | | | |
| Средства кредитных организаций | | 12 763 | 59 005 |
| Средства клиентов | | 456 261 | (544 448) |
| Прочие обязательства | | (1 916) | (220) |
| **Чистые денежные потоки от операционной деятельности до налога на прибыль** | | **160 518** | **(186 305)** |
| Уплаченный налог на прибыль | | (8 982) | (46 976) |
| **Чистое поступление денежных средств от операционной деятельности** | | **151 536** | **(233 281)** |
| **Денежные потоки от инвестиционной деятельности** | | | |
| Приобретение основных средств | | (5 896) | (6 941) |
| Поступления от реализации основных средств и нематериальных активов | | 832 | 732 |
| Приобретение нематериальных активов | | (15 368) | (9 749) |
| **Чистое расходование денежных средств в инвестиционной деятельности** | | **(20 432)** | **(15 958)** |
| **Денежные потоки от финансовой деятельности** | **31** | | |
| Выплаты по обязательствам по договорам аренды | | (2 524) | (2 257) |
| Погашение субординированных займов | | - | - |
| **Чистое расходование денежных средств в финансовой деятельности** | | **(2 524)** | **(2 257)** |
| Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты | | 20 437 | (812) |
| Влияние ожидаемых кредитных убытков на денежные средства и их эквиваленты | | 56 | (3 894) |
| **Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов** | | **149 073** | **(256 202)** |
| Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года | | 301 763 | 557 965 |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года** | **6** | **450 836** | **301 763** |

Председателя Правления — В.К. Лиходиевский

Главный бухгалтер — Л.Д. Левданская

Дата подписания: 29 мая 2024 г.

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ НЕЗАВИСИМОЙ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

### по консолидированной финансовой отчетности Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) за период с 1 января по 31 декабря 2023 г.

Г-ну Лиходиевскому Владимиру Константиновичу
Председателю Правления
Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь)

Акционерам, Совету директоров, Аудиторскому комитету
Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь)

***Мнение***

Мы провели аудит консолидированной финансовой отчетности Закрытого акционерного общества Банк ВТБ (Беларусь) (место нахождения: 220007, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Московская, 14; дата государственной регистрации: 7 октября 1996 г., регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 101165625) и его дочерних организаций (далее – «Банк»), состоящей из консолидированного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2023 г., консолидированного отчета о прибыли или убытке, консолидированного отчета о совокупном доходе, консолидированного отчета об изменениях в собственном капитале и консолидированного отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к консолидированной финансовой отчетности, включая краткий обзор основных положений учетной политики.

По нашему мнению, прилагаемая консолидированная финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных отношениях консолидированное финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2023 г., а также ее консолидированные финансовые результаты и консолидированное движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (МСФО).

***Основание для выражения мнения***

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь *«Об аудиторской деятельности»*, национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь, и Международными стандартами аудита (МСА). Наши обязанности в соответствии с этими правилами и стандартами описаны далее в разделе «Ответственность аудиторской организации за аудит консолидированной финансовой отчетности» нашего заключения. Мы независимы по отношению к Группе в соответствии с принятым Советом по международным стандартам этики для бухгалтеров (СМСЭБ) Международным кодексом этики профессиональных бухгалтеров (включая международные стандарты независимости) (Кодекс СМСЭБ) и этическими требованиями, применимыми к нашему аудиту консолидированной финансовой отчетности в Республике Беларусь, и нами выполнены прочие этические обязанности в соответствии с этими требованиями и Кодексом СМСЭБ.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения.

***Ключевые вопросы аудита***

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита консолидированной финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита консолидированной финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам. В отношении указанного ниже вопроса наше описание того, как данный вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Ответственность аудиторской организации за аудит консолидированной финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этому вопросу. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения консолидированной финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанного ниже вопроса, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой консолидированной финансовой отчетности.

| Ключевой вопрос аудита | Как соответствующий ключевой вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита |
|---|---|
| **Резерв под ожидаемые кредитные убытки по кредитам в соответствии с МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты»** | |
| Определение величины резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам является ключевой областью суждения руководства Банка.<br>Выявление факторов значительного увеличения кредитного риска, включающее выявление изменения риска наступления дефолта на протяжении всего оставшегося срока действия финансового инструмента, а также определение значений вероятности дефолта и уровня потерь при дефолте является процессом, включающим значительное использование профессионального суждения и допущений.<br>Использование различных новых моделей и допущений в расчете ожидаемых кредитных убытков и объемных исходных данных могут существенно повлиять на уровень резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам. В силу существенности сумм кредитов, предоставленных клиентам, а также значительного использования профессионального суждения при применении МСФО (IFRS) 9, оценка резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам представляет собой ключевой вопрос аудита.<br>Информация о резерве под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и подход руководства Банка к оценке и управлению кредитным риском описаны в примечаниях 3, 10 и 26 к консолидированной финансовой отчетности. | Наши аудиторские процедуры включали в себя анализ методологии оценки резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам, предоставленным юридическим и физическим лицам, тестирование средств контроля над процессом кредитования клиентов, включая тестирование контролей по учету просроченной задолженности, а также оценку факторов значительного увеличения кредитного риска и признаков обесценения кредитов.<br>В отношении оценки резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам мы провели анализ допущений, изучение исходных данных, использованных Банком, а также анализ модели вероятности дефолта. Мы проанализировали классификацию кредитов по этапам кредитного качества и произвели пересчет резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам.<br>Мы проанализировали суждения руководства Банка, применяемые при расчете резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам.<br>Мы проанализировали информацию о резерве под ожидаемые кредитные убытки по кредитам, раскрытую в примечаниях к консолидированной финансовой отчетности. |

***Ответственность руководства и Аудиторского комитета ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) за консолидированную финансовую отчетность***

Руководство несет ответственность за подготовку и достоверное представление указанной консолидированной финансовой отчетности в соответствии с МСФО и за систему внутреннего контроля, которую руководство считает необходимой для подготовки консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок.

При подготовке консолидированной финансовой отчетности руководство несет ответственность за оценку способности Группы продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Группу, прекратить ее деятельность или когда у руководства нет реальной альтернативы таким действиям.

Аудиторский комитет ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) несет ответственность за надзор за процессом подготовки консолидированной финансовой отчетности Банка.

***Ответственность аудиторской организации за аудит консолидированной финансовой отчетности***

Наши цели заключаются в получении разумной уверенности в том, что консолидированная финансовая отчетность в целом не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок, и в выпуске аудиторского заключения, содержащего наше мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь *«Об аудиторской деятельности»*, национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь, и Международными стандартами аудита, всегда выявит существенное искажение при его наличии. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что по отдельности или в совокупности они могли бы повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой консолидированной финансовой отчетности.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь *«Об аудиторской деятельности»*, национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь, и Международными стандартами аудита, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения консолидированной финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и проводим аудиторские процедуры в ответ на эти риски; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения. Риск необнаружения существенного искажения в результате недобросовестных действий выше, чем риск необнаружения существенного искажения в результате ошибок, так как недобросовестные действия могут включать сговор, подлог, умышленный пропуск, искаженное представление информации или действия в обход системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля, имеющей значение для аудита, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности системы внутреннего контроля Группы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность оценочных значений, рассчитанных руководством, и раскрытия соответствующей информации;
- делаем вывод о правомерности применения руководством допущения о непрерывности деятельности, и, на основании полученных аудиторских доказательств, вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, которые могут вызвать значительные сомнения в способности Банка продолжать непрерывно свою деятельность. Если мы приходим к выводу о наличии существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в нашем аудиторском заключении к соответствующему раскрытию информации в консолидированной финансовой отчетности или, если такое раскрытие информации является ненадлежащим, модифицировать наше мнение. Наши выводы основаны на аудиторских доказательствах, полученных до даты нашего аудиторского заключения. Однако будущие события или условия могут привести к тому, что Банк утратит способность продолжать непрерывно свою деятельность;
- проводим оценку представления консолидированной финансовой отчетности в целом, ее структуры и содержания, включая раскрытие информации, а также того, представляет ли консолидированная финансовая отчетность лежащие в ее основе операции и события так, чтобы было обеспечено их достоверное представление;
- получаем достаточные надлежащие аудиторские доказательства в отношении финансовой информации организаций и хозяйственной деятельности внутри Банка, чтобы выразить мнение о консолидированной финансовой отчетности. Мы отвечаем за общее руководство, контроль и проведение аудита Банка. Мы являемся единолично ответственными за наше аудиторское мнение.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с Советом директоров и Аудиторским комитетом ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированном объеме и сроках аудита, а также о существенных замечаниях по результатам аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, если мы выявляем таковые в процессе аудита.

Мы также предоставляем Совету директоров и Аудиторскому комитету ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) заявление о том, что мы соблюдали все соответствующие этические требования в отношении независимости и информировали их обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать оказывающими влияние на независимость аудитора, а в необходимых случаях – о действиях, осуществленных для устранения угроз, или принятых мерах предосторожности.

Из тех вопросов, которые мы довели до сведения Совета директоров и Аудиторского комитета ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), мы определяем вопросы, которые были наиболее значимыми для аудита консолидированной финансовой отчетности за текущий период, и которые, следовательно, являются ключевыми вопросами аудита. Мы описываем эти вопросы в нашем аудиторском заключении, кроме случаев, когда публичное раскрытие информации об этих вопросах запрещено законом или нормативным актом, или когда в крайне редких случаях мы приходим к выводу о том, что информация о каком-либо вопросе не должна быть сообщена в нашем заключении, так как можно обоснованно предположить, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят общественно значимую пользу от ее сообщения.

Руководитель задания

Лащенко Павел Анатольевич,
Генеральный директор, FCCA

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0000738 от 14 мая 2003 г., без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, открытом акционерном обществе «Банк развития Республики Беларусь», небанковских кредитно-финансовых организациях, банковских группах и банковских холдингах № 142 от 13 октября 2022 г., сроком на пять лет.

Руководитель аудиторской группы

Иванов Андрей Васильевич,
Заместитель начальника отдела аудита, FCCA

Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 0002358 от 6 октября 2016 г., без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям и требованиям к деловой репутации, предъявляемым к аудиторам, оказывающим аудиторские услуги в банках, открытом акционерном обществе «Банк развития Республики Беларусь», небанковских кредитно-финансовых организациях, банковских группах и банковских холдингах № 130 от 26 августа 2021 г., сроком на пять лет.

29 мая 2024 г.

Аудиторское заключение получил:

Председатель Правления
ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) — Лиходиевский Владимир Константинович

***Сведения об аудиторской организации***

Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «Б1 Аудиторские услуги»
Зарегистрировано 7 апреля 2005 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190616051.
Является членом Аудиторской палаты с 26 декабря 2019 г.
Регистрационный номер записи аудиторской организации в аудиторском реестре – 10051, дата включения в аудиторский реестр – 1 января 2020 г.
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, д. 51А, 15-й этаж.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов**:

**Лот № 1.** ½ доля в праве собственности на объект недвижимости: недвижимое улучшение – капитальное строение с инв. № 235/С-3694, площадь 55,4 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, расположенное на земельном участке с кадастровым № 225183012602000001. Составные части и принадлежности: мансарда, подвал, баня, две калитки, трое ворот, два ограждения, артезианская скважина, теплица, бассейн, пять площадок. Имущество расположено по адресу: Витебская обл., Чашникский район, Лукомльский с/с, д. Торопы, ул. Озёрная, 18.

Характеристики лота № 1. Кап. строение имеет подвальный этаж, 1 и 2 этажи, мансардный этаж. Целевое назначение зем. участка: для строительства и обслуживания жилого дома. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Зем. участок предоставлен на праве общего долевого пожизненного наследуемого владения (доля – ½). Общая площадь всего участка: 0,2274 га. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: ограничение (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос (озеро Лукомльское), ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000В. Сведения об ограничениях (обременениях) прав на соответствующее имущество (кап. строение с инв. № 235/С-3694): арест ½ доли установлен Постановлением о наложении ареста на имущества от 18.10.2010 б/н. (арест снимается по решению суда после полной оплаты стоимости приобретенного имущества). Возможно выделение доли в праве собственности на объект недвижимости в натуре. Рядом озеро Лукомльское.

**Нач. цена продажи имущества: 33 336 белорусских рублей и 00 копеек. Размер задатка: 3333 белорусских рубля 60 копеек.**

**Условия:** 1. Участник аукциона, выигравший торги, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе предмета торгов не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 рабочих дней. Оплата стоимости приобретенного на аукционе недвижимого имущества иностранными физическими и юридическими лицами осуществляется в установленном порядке за белорусские рубли или за иностранную валюту по официальному курсу белорусского рубля по отношению к иностранной валюте, установленному Национальным банком на дату платежа в соответствии с валютным законодательством. 2. Оформление документов и переход права собственности на приобретенный на аукционе предмет торгов осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Для участия в аукционе приглашаются резиденты РБ и нерезиденты РБ, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, предоставили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона www.marketvit.by.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Повторный аукцион состоится 11.07.2024 в 15.00** по адресу: 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи заявления и документов: с 19.06.2024 в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 4). Последний срок подачи заявления и прилагаемых к нему документов **10.07.2024 до 15.00**. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 09.02.2024, 06.04.2024. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с имеющейся документацией на предмет торгов, а также возможность осмотра предмета торгов на местности. Телефоны для справок: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607, УНП 191021390, (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23, УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении.**
Месторасположение**: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Год выпуска | Инвен. номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, г/н АР 8134-7 | 2010 | 200061 | **20 880,00** |
| **2** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, г/н АР 8175-7 | 2011 | 200042 | **20 880,00** |
| **3** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, г/н АР 9561-7 | 2011 | 200272 | **20 880,00** |
| **4** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, г/н АР 8128-7 | 2011 | 200044 | **20 880,00** |
| 5 | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, г/н АР 8105-7 | 2011 | 200032 | **20 880,00** |
| **6** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER RUCAR, г/нAI 3973-7 | 2009 | 200258 | **23 400,00** |
| **7** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, г/н АР 9573-7 | 2011 | 200263 | **20 880,00** |
| **8** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, г/н АР 8202-7 | 2008 | 200137 | **17 520,00** |
| **9** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER RUCAR, г/н АР 8097-7 | 2009 | 200017 | **15 600,00** |
| 10 | PEUGEOT BOXER PRACTIK PR1620, г/н АК 7353-7 | 2011 | 200256 | **24 720,00** |
| **11** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, г/н АР 8203-7 | 2008 | 200136 | **15 600,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущие извещения опубликованы: по лотам №№ 1–10 – в газете «Звязда» 24.05.2024, по лоту № 11 – в газете «Рэспубліка» 31.05.2024

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.07.2024 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.07.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

## Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»

### извещает о проведении повторных электронных торгов № 2024.Г.002.00066 по продаже государственного имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 2 июля 2024 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Продавец:** РУП «Витебское племпредприятие»

**Лот № 1.** Принтер MARKEM-IMAGE 9405, 2017 г. в., серийный номер FR17310177, инв. № 1104, находящийся по адресу: г. Витебск, пер. 1 Шумилинский, 1. **Нач. цена: 2550,00 бел. руб. без учета НДС.**

Срок внесения задатков и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по торгам**: до 16.00 01.07.2024.** Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу www.gki.gov.by в разделе Главная / Бизнесу / ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА / Движимое имущество.

# ГАРЭЦЬ НЕЖАДАННЕМ

## Як распазнаць і пераадолець эмацыянальнае выгаранне?

**Эмацыянальнае выгаранне стала сапраўдным бічом нашага стагоддзя. У 2019 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўключыла прафесійны сіндром эмацыянальнага выгарання ў Міжнародную класіфікацыю хвароб. З-за чаго яно здараецца і як яго своечасова заўважыць? Як не «згарэць» на рабоце? І ці абавязкова яе мяняць, калі яна вас давяла да знясілення? У якіх сферах людзі больш схільныя да выгарання? Якія штодзённыя звычкі дапамогуць яго пазбегнуць і навошта кожны дзень «з'ядаць жабу». Пра гэта размаўляем з псіхолагам гарадскога Цэнтра здароўя Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Кацярынай ЧУЯШОВАЙ.**

***— Што такое эмацыянальнае выгаранне і з-за чаго яно здараецца?***

— Выгаранне — гэта эмацыянальнае, фізічнае і псіхалагічнае знясіленне. Яго прычыны могуць быць як унутраныя, так і знешнія. Знешнія — гэта пэўныя абставіны, якія нас акружаюць. Калі ўзяць работу, то яна чалавеку не падыходзіць, ці намаганні, якія ён прыкладае, не ўзнагароджваюцца належным чынам, ці таксічны калектыў, дрэнныя адносіны з кіраўніцтвам. Да выгарання могуць прыводзіць рэзкія змены ў жыцці, калі, напрыклад, нараджаецца дзіця. Увогуле, эмацыянальнае выгаранне можа быць звязана з рознымі сферамі жыцця.

Унутраныя прычыны часта звязаны з узростам чалавека, яго здароўем. Старэйшыя людзі і людзі з праблемамі са здароўем больш схільныя да эмацыянальнага выгарання. Таксама яно можа здарацца з-за нашых завышаных чаканняў, псіхалагічных асаблівасцяў, павышанага знясільвання, перфекцыянізму. Прычын вельмі шмат.

***— Як заўважыць гэты стан?***

— Найперш могуць з'явіцца фізічныя прыкметы, напрыклад, мяняецца сон: пачынаецца бяссонніца ці, наадварот, увесь час хочацца спаць. У харчаванні гэта страта апетыту ці, наадварот, пераяданне. Акрамя таго, характэрная хранічная стомленасць і не атрымліваецца адпачыць, як бы чалавек не імкнуўся абстрагавацца. Нават сустрэча з сябрамі ў такім выпадку ўспрымаецца як праца, на якую патрэбны сілы, а іх няма.

З эмацыянальнага боку дні становяцца бязрадаснымі, сумнымі, шэрымі, падобнымі адзін да другога, і ўспомніць абсалютна няма чаго: год прайшоў, і нічога быццам бы не адбывалася. Мэты не дасягаюцца, і не хочацца іх ставіць, яны ўжо не натхняюць. Падае самаацэнка, навакольныя пачынаюць раздражняць, пагаршаюцца адносіны, не хочацца ні з кім кантактаваць.

Такі стан можна параўнаць з батарэяй у тэлефоне. Калі мы своечасова не будзем адпачываць, наша батарэя ўсё больш разраджаецца, і ў выніку застаецца 5 %, і ў такі момант не заўсёды магчыма падзарадзіць яе. Калі здарыцца такая поўная разрадка, прыйдзецца доўга і цяжка аднаўляцца. Значна прасцей своечасова злавіць гэтыя адчуванні і дапамагчы сабе.

Калі з'яўляюцца фізічныя прыкметы, пра якія я сказала, гэта яшчэ і сігнал звярнуцца да доктара. Магчыма, прычына ў нейкіх захворваннях, якія развіваюцца, а чалавек не заўважае.

***— Мы згадвалі, што часта выгаранне здараецца з-за работы. Раскажыце пра яго асаблівасці.***

— Яно наступае, калі людзі не разлічылі свае сілы. Такое выгаранне ідзе па пэўных стадыях. Спачатку чалавек шмат фантазіруе, у яго выпрацоўваецца гармон радасці дафамін, ён улюбёны ў сябе будучага, калі ён возьме на сябе ўсе задачы і якім тады стане: пройдзе навучанні, шмат работ зробіць. У гэты перыяд ідэалізацыі можна не заўважыць, што ўжо не хапае дафаміну. Таму мы і пачынаем гэтыя задачы прыдумваць, каб неяк сябе ўзбадзёрыць.

Як дапамагчы сабе на гэтай стадыі? Адпачываць да таго, як стаміўся. Гэта як тэхабслугоўванне аўтамабіля: памяняць дэталь да таго, як яна зламалася. Гэта неабходнасць, бо адна з прычын выгарання — тое, што адпачываць мы не ўмеем.



Больш за тое, у многіх людзей ёсць устаноўка, што адпачываць сорамна. Вядома шмат прымавак, накшталт «Праца гадуе, а лянота марнуе», «Каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці». Так, праца дапамагае захаваць у тым ліку і псіхічнае здароўе, але такія ўстаноўкі часта перашкаджаюць адпачываць.

У выніку ўсё роўна чалавек не працуе ўвесь гэты час. Узровень картызолу паднімаецца, і мозг будзе чалавека выключаць. І мы ловім сябе на тым, што скролім сацсеткі ці ляжым і абураемся на сябе, што нічога не робім. Гэта не будзе ні паўнацэнным адпачынкам, ні работай. Таму важна ўмець размяжоўваць і даваць сабе магчымасць адпачываць: нічога не рабіць ці рабіць тое, што сапраўды падабаецца. Заняцца творчасцю, зладзіць прагулку на прыродзе — каб быў рэальны для вас адпачынак. Гэта можа спрацаваць на першай стадыі.

Наступная стадыя — знясіленне. Пасля таго, як адбыўся дафамінавы душ і мы бегалі акрыленыя, улюбёныя ў сябе будучага, у пэўны момант мы пачынаем адчуваць, што не выцягваем, бо планы складзены нерэалістычныя, а мэты пастаўлены завышаныя. Сітуацыя ўскладняецца, калі мы не цэнім маленькія дасягненні, не заўважаем невялікія крокі, бо насамрэч глабальныя мэты жывому чалавеку дасягнуць вельмі складана. Узнікае знясіленне, навакольныя пачынаюць раздражняць, жыццё ператвараецца ў бясконцыя бязрадасныя будні. Могуць з'явіцца фізічныя прыкметы: падае імунітэт, з'яўляюцца стомленасць, прастудныя захворванні, галаўныя болі, ломіць мышцы, баліць страўнік. Паступова гэта можа прывесці да поўнай страты мэт, і работа становіцца фармальнай. Гэта нярэдка можна заўважыць у педагогаў, медыкаў, калі выконваецца толькі тое, што неабходна без усялякага дадатковага ўключэння.

На самай апошняй стадыі, калі псіхасаматыка ўключаецца яшчэ больш, трэба звяртацца да спецыялістаў. Неабходны сур'ёзны адпачынак і змена дзейнасці.

***— Вы сказалі пра педагогаў і медыкаў. Ці значыць гэта, што да эмацыянальнага выгарання больш схільныя прадстаўнікі тых прафесій, якія заключаюцца ў працы з людзьмі?***

— Так, у сферы «чалавек — чалавек», дзе вялікая колькасць кантактаў, людзі больш схільныя да выгарання. Зразумела, што тут адыгрываюць ролю і індывідуальныя асаблівасці, напрыклад, калі вы інтраверт, але вымушаны шмат кантактаваць, пазбегнуць выгарання складана.

Вядуць да яго і некаторыя сучасныя трэнды. Адзін з іх — «дасягатарства». Любімыя блогеры паўтараюць людзям, што кожную хвіліну трэба выкарыстоўваць эфектыўна, усё павінна быць падпарадкавана росту. Але не кожны з гэтым справіцца. Такое перанапружанне рэдка каго матывуе і не прыводзіць да скачку ці росту — найчасцей вядзе да выгарання. Яшчэ больш узмацняецца пачуццё віны за адпачынак, яшчэ ніжэй падае самаацэнка, пачынаецца самабічаванне, чалавек не можа ацэньваць сябе рэалістычна.

Добра, што цяпер з'явіліся супрацьлеглыя трэнды — на кантакт з сабой, на тое, каб быць у рэсурсе, слухаць сябе. Вось на іх можна звярнуць увагу, бо гэта ўсё ж бліжэй да чалавечай прыроды.

Спрыяюць выгаранню не свае каштоўнасці, калі чалавек не ўсведамляе ўласныя патрэбы. Нам трансліруецца, што адпачынак на Балі такі выдатны, а чалавек, магчыма, любіць пагуляць па лесе, але лічыць, што трэба ехаць на Балі. Ці бярэ крэдыты, каб набыць аўтамабіль у салоне, а пасля высвятляецца, што ён не вельмі і радуе, яму камфортней на таксі ездзіць.

***— Калі не звяртацца да спецыялістаў, да чаго можа прывесці эмацыянальнае выгаранне?***

— Поўнае спустошванне, псіхічнае і фізічнае. Магчымы дэпрэсіі, трывожныя расстройствы, побач стаяць і нашы залежнасці, у тым ліку хімічныя. Таксама праблемы з фізічным здароўем. Стрэс, напружанне назапашваюцца і праяўляюць сябе ў целе. Гэта захворванні сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, страўнікава-кішэчнага тракта, алергіі, і з гэтым складана штосьці зрабіць без спецыялістаў.

***— Колькі часу патрэбна, каб пазбавіцца ад эмацыянальнага выгарання?***

— Залежыць ад таго, у якім стане быў чалавек, ад яго рэсурсаў. Дапамагае заўсёды, калі развіты іншыя сферы. З прафесійным выгараннем лягчэй справіцца, калі ў цябе ўсё добра ў сям'і, са здароўем, ёсць хобі, фінансавая аддача. І гэта датычыцца ўсіх сфер. Калі выгаранне ў маладой маці, лягчэй справіцца, калі ёсць памочнікі, сродкі, добрыя адносіны з мужам, сяброўкі. Чым лепш развіта наша кола балансу, тым прасцей перанесці нейкі перакос, калі штосьці ідзе не так у пэўнай сферы.

***— Калі на рабоце адбылося выгаранне, варта мяняць месца?***

**«Унутраныя прычыны часта звязаны з узростам чалавека, яго здароўем. Старэйшыя людзі і людзі з праблемамі са здароўем больш схільныя да эмацыянальнага выгарання. Таксама яно можа здарацца з-за нашых завышаных чаканняў, псіхалагічных асаблівасцяў, павышанага знясільвання, перфекцыянізму. Прычын вельмі шмат».**

— Зусім неабавязкова. Часам дастаткова размовы з кіраўніцтвам, калі чалавека перавядуць у іншы аддзел, іншы кабінет, павысяць заробак, памяняюць задачы, калі ў гэтым была прычына. А калі незадаволенасць, знясіленне назапашваюцца вельмі доўга, то часам дапаможа толькі змена месца працы. Зноў жа трэба працаваць з прычынамі выгарання, не баяцца звяртацца да спецыялістаў, псіхолагаў, бо тыя ж прычыны, што прывялі да выгарання на адной рабоце, могуць прывесці да яго і на іншай. Гэта і няўменне паводзіць сябе ў канфліктах, няўменне ставіць мэты. Апошняе, дарэчы, вельмі важна. Яны павінны быць адэкватныя: і не зусім дробныя, якія не радуюць, і пасільныя — як зона найбліжэйшага развіцця. Важна мець адэкватную самаацэнку. Калі мы сябе папракаем за тое, што не дасягнулі супервынікаў, гэта сведчыць не пра заніжаную, а пра завышаную самаацэнку. Тут трэба спытаць, чаму мы ад сябе, звычайнага чалавека, патрабуем грандыёзнасці.

***— Калі падсумоўваць, што варта рабіць, каб не было выгарання? Ці ёсць нейкія лайфхакі, якія можна выкарыстоўваць штодня?***

— Найперш усведамляць важнасць адпачынку. Гэта не менш важна, чым работа. Мець хобі, якія радуюць, зараджаюць, як энергетычныя батончыкі. Для гэтага добра разумець свае патрэбы. Часам даюць парады, якія толькі раздражняюць: прыняць пенную ванну ці пайсці на прабежку, якую чалавек успрымае як цяжкую працу. І тут было б добра развіваць адчувальнасць да сваіх патрэб. Гэта можа быць кантактаванне, чытанне добрай кнігі, ёга, добры фільм, клопат пра хатніх гадаванцаў, творчасць, музыка, нават карціна па нумарах... Выдатна, калі ў жыцці ёсць месца фізічнай актыўнасці. Калі гэта не спартзала, то хаця б прагулкі ці крыху практыкаванняў дома. Чым больш рэсурсу, чым мы лепш адаптаваны, тым менш схільныя да выгарання.

Вялікія мэты лепш драбіць на маленькія, каб бачыць, калі дасягнуты пэўны этап. Тады мы атрымліваем дафамін, умацоўваецца наша самаацэнка, прыходзіць усведамленне, што мы нешта зрабілі. Таксама важна прызнаваць свае вынікі, у тым ліку і негатыўныя. Гэта ж таксама вынік, і наступны раз мы паспрабуем зрабіць па-іншаму. Не трэба лаяць сябе, упадаць у самабічаванне, варта ўключацца ў працэс і спрабаваць зрабіць па-іншаму. Таксама абмяжоўваем час у сацсетках. Вылучаем канкрэтны час на адпачынак і на напружанне. У сярэднім кожную гадзіну на 10 хвілін трэба рабіць перапынак.

Добра ўзяць звычку «з'есці жабу»: кожны дзень рабіць тое, што вісіць і рабіць не хочацца, напрыклад непрыемная размова са сваяком, задача на рабоце, якую даўно адкладвалі, пачаць займацца на турніку. І ў дзень «з'ядаць» адну такую «жабу». Добрая практыка ў канцы дня — пералічыць чатыры месцы, дзе я сёння малайчына ці што добрага са мной адбывалася. Такая простая тэхніка дае магчымасць зрабіць вялікія адкрыцці: мы ўспамінаем тое, што ў адваротным выпадку проста сцерлася б з памяці. Напрыклад, сёння я ўдала апранулася і добра выглядала, дамовілася па працы, прыгатавала добрую вячэру і яе з задавальненнем з'елі, дапамагла сяброўцы, зрабіла ўдалую пакупку. Не трэба абясцэньваць такія простыя рэчы, гэта важна для самаацэнкі.

Карысна расстаўляць фокусы ўвагі: ставіць на месяц канкрэтную мэту, дзе будуць сканцэнтраваны нашы намаганні. Дзе фокус увагі, там і дзеянні, і вынік. Напрыклад, месяц прысвячаю здароўю: сачу за харчаваннем, прымаю вітаміны, запісваюся нарэшце на прыём да ўрача.

Адна з прычын выгарання — ігнараванне фізіялагічных патрэб. Гэта вельмі важна. Найперш сон, у сярэднім восем гадзін, і сном мы не ахвяруем ні дзеля чаго. Захоўваем рэжым харчавання, сочым, каб яно было збалансаваным. Абавязкова даём сабе фізічную нагрузку. І сочым за паказчыкамі арганізма, для гэтага своечасова наведваем урача і здаём прызначаныя аналізы.

**Алена КРАВЕЦ.**

Спорт-тайм

# Казань падарыла россып медалёў

### Якім для беларускіх спартсменаў стаў першы тыдзень Гульняў БРІКС

**САМБА.** Карына Шут стала чэмпіёнкай у катэгорыі да 80 кг, Даніэла Ждан — у катэгорыі да 65 кг. Уладзіслаў Бурдзь (да 58 кг) і Анфіса Капаева (да 50 кг), Уладзіслаў Мардусевіч (да 71 кг) заваявалі сярэбраныя медалі Гульняў БРІКС. Алена Купава (да 54 кг), Данііл Патачыц (да 88 кг), Дзмітрый Хахлоў (звыш 98 кг), Таццяна Мацко (да 59 кг) — бронзавыя медалі.

**СІНХРОННАЕ ПЛАВАННЕ.** Васіліна Хандошка — пераможца спаборніцтваў у адвольнай праграме сярод салістак. Таксама яна стала сярэбраным прызёрам у тэхнічнай праграме. Анастасія Дабравольская і Аляксандра Міронччык заваявалі сярэбраныя медалі ў тэхнічнай праграме сярод дуэтаў. Іх поспех у адвольнай праграме паўтарылі Маргарыта Кірылюк і Валерыя Валасач. У выступленні акрабатычных груп Ганна Каўцун, Маргарыта Кірылюк, Ксенія Куляшова, Яна Кудзіна, Анастасія Дабравольская, Яна Трацэўская, Ксенія Лебедзева і Валерыя Валасач занялі другое месца. Апошнім відам праграмы ў сінхраністак сталі групавыя спаборніцтвы ў адвольнай праграме. Каманда Беларусі, за якую выступалі Вера Буцэль, Ганна Каўцун, Маргарыта Кірылюк, Ксенія Куляшова, Яна Кудзіна, Анастасія Дабравольская, Яна Трацэўская і Аляксандра Міронччык, заняла трэцяе месца.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА.** Сваё выступленне на Гульнях БРІКС нашы лёгкаатлеты скончылі, маючы ў сваім актыве 30 медалёў. Чэмпіёнамі спаборніцтваў сталі бегуны Дзмітрый Савін (800 м) і Эльвіра Грабарэнка (100 м з бар'ерамі), Алена Дубіцкая (штурханне ядра) і Анастасія Маслова (кіданне молата), Таццяна Халадовіч (кіданне кап'я). Другія месцы ў сваіх відах занялі Дзмітрый Іваненка (3000 м з перашкодамі), Максім Андралайць (дзесяцібор'е), Лізавета Валуева (скачкі ў вышыню), Аляксей Каткавец (кіданне кап'я), Алена Собалева (кіданне молата). Эстафетныя каманды 4х400 таксама сталі пераможцамі. У жаночую каманду ўвайшлі Аляксандра Хільмановіч, Крысціна Мулярчык, Кацярына Жываева і Ганна Міхайлава, мужчынскую чацвёрку склалі Марк Пацей, Міхаіл Міхноўскі, Ігар Зубко і Раман Валадзькін. На трэцюю прыступку п'едэстала ўзняліся Мацей Волкаў (скачкі з шастом), Уладзіслаў Пучко (кіданне дыска) і Святлана Парахонька (100 м з бар'ерамі).

**АКАДЭМІЧНАЕ ВЕСЛАВАННЕ.** Беларускія спартсмены заваявалі 15 медалёў Гульняў БРІКС. У мужчынскім заездзе чацвёрак парных найлепшым стаў беларускі экіпаж, які склалі Мікалай Шарлап, Павел Сіненка, Міхаіл Іванчыкаў і Дзяніс Кучароў. У аналагічным выглядзе праграмы ў жанчын беларускі Вікторыя Васільева, Анастасія Іўлева, Віялета Каратыш і Алена Фурман сталі сярэбранымі прызёрамі. Мужчынская васьмёрка — Аляксей Бандзюк, Сяргей Валадзько, Дзмітрый Выберанец, Дзяніс Клімята, Антон Купалаў, Арцём Лапуцін, Уладзіслаў Лакун, Дзмітрый Фурман і рулявая Паліна Кацэвіч — чэмпіёны Гульняў краін БРІКС. У гэтай жа дысцыпліне ў жанчын Дар'я Новікава, Вераніка Анацка, Паліна Залатарова, Алена Пімяненкава, Крысціна Мотуз, Валерыя Шэндэль, Валерыя Маркоўская і Таццяна Ганчарова разам з рулявым Данілам Гайцюкевічам паказалі другі вынік. У заездах двоек парных сярэбраныя медалі выйгралі Павел Сіненка і Міхаіл Іванчыкаў, Андрэй Федарэнка і Мікіта Карнееў (лёгкая вага), а таксама Алена Фурман і Віялета Каратыш. У фінале двоек парных лёгкай вагі нашы Таццяна Ганчарова і Крысціна Мотуз фінішавалі трэцімі. У заездзе жаночых адзіночак у лёгкай вазе роўных не было Алене Фурман. У мужчын у гэтай праграме лідарам стаў Мікіта Карнееў.

**КАРАТЭ.** Не засталіся без медалёў Гульняў БРІКС і беларускія каратысты. Сярэбранымі прызёрамі турніру сталі Мікіта Кірыевіч (да 84 кг) і Іван Кудзінаў (звыш 84 кг). У катэгорыі звыш 84 кг бронзавым прызёрам стаў яшчэ адзін беларус Аляксей Водчыц.

**БАДМІНТОН.** Беларускія бадмінтаністы завяршылі выступленні на Спартыўных гульнях краін БРІКС. У жаночым адзіночным разрадзе на трэцяй пазіцыі размясцілася Сафія Яноўская. У мужчынскім парным разрадзе нашы Міхаіл Макараў і Глеб Швыдкоў выйгралі групу «С», атрымаўшы перамогі над прадстаўнікамі Афганістана, Малі і Сірыі. У чвэрцьфінале беларусы апярэдзілі сапернікаў з Бразіліі, але ў наступным крузе прайгралі расіянам і таксама атрымалі бронзу.

**ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА.** Дар'я Навумава — чэмпіёнка ў катэгорыі да 81 кг, Аліна Шчапнава — да 59 кг. У катэгорыі звыш 81 кг Дар'я Хэйдэр заваявала сярэбраны медаль, такі ж медаль у катэгорыі да 89 кг заваяваў і Юліян Курловіч. Роберт Куроўскі (звыш 102 кг) і Вадзім Ліхарад (да 73 кг) заваявалі бронзавыя медалі.

**Спартыўная гімнастыка.** Беларускія гімнасты Ягор Шарамкоў і Кіра Магарэвіч заваявалі чарговыя медалі Спартыўных гульняў краін БРІКС. Ягор Шарамкоў паказаў трэці вынік у апорным скачку (14,216 бала). Раней Шарамкоў заваяваў золата ў вольных практыкаваннях і стаў трэцім у мнагабор'і. Кіра Магарэвіч заняла трэцяе месца ў практыкаванні на бервяне і мнагабор'і. Таксама бронзавымі прызёрамі Гульняў сталі Яраслаў Крутаў (вольныя) і Алена Цітавец (рознавысокія брусы).

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## 18 ЧЭРВЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1838** год — нарадзіўся (в. Касцюкі, цяпер Лятчанскі сельсавет, Віцебскі раён) Фёдар Махноў, паводле шэрагу звестак, самы высокі чалавек з тых, якія калі-небудзь жылі на Зямлі. Паводле кнігі «Жыццё» (франц. La Vie) французскага біёлага Жана Растана, увесну 1905 года, у 26 гадоў, пры наведванні Заходняй Еўропы Махноў меў рост 2,85 метра, вагу 182 кілаграмы, даўжыню далоні 32 сантыметры і даўжыню ступні — 51 см.



**1923** год — горад Ігумен перайменаваны ў Чэрвень. Ігумен перайменавалі ў Чэрвень у гонар месяца вызвалення мястэчка ад польскіх захопнікаў 1920 года, хоць на самай справе гэта адбылося толькі 9 ліпеня.

**1979** год — нарадзіўся (г. Мінск) Аляксей Грышын, беларускі спартсмен (фрыстайл, лыжная акрабатыка), заслужаны майстар спорту Беларусі. Бронзавы прызёр XIX зімовых Алімпійскіх гульняў (2002). Чэмпіён свету, сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету. Сярэбраны і бронзавы прызёр этапу Кубка свету. Чэмпіён Алімпійскіх гульняў (2010).

У свеце

**1815** год — паражэнне Напалеона ў бітве пры Ватэрлоа. Гэтая бітва пры невялікім населеным пункце за 15 кіламетраў ад Бруселя стала апошняй спробай Напалеона І Банапарта вярнуць страчаную пасля вайны супраць кааліцыі ўладу.

**1940** год — Шарль дэ Голь звярнуўся з прамовай да французаў, у якой заклікаў іх уступаць у Рух супраціўлення нямецкім акупантам. У той час, калі маршал Пэтэн вёў перамовы аб капітуляцыі, дэ Голь паляцеў у Лондан, адкуль па радыё і звярнуўся з заклікам да суайчыннікаў працягваць змаганне з захопнікамі. Заснаваў у Лондане рух «Вольная Францыя». Пазней ім быў створаны Французскі камітэт нацыянальнага вызвалення. Дэ Голь быў спачатку прызначаны яго сустаршынёй (разам з генералам Анры Жыро), а пасля — аднаасобным старшынёй.



**1942** год — нарадзіўся Пол Макартні, брытанскі кампазітар, рок-музыкант, спявак. Адзін з заснавальнікаў і ўдзельнікаў групы The Beatles.

Так гаварыў...

**УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ:**

*«Хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае — асуджаны зноў перажыць яго. Безліч разоў».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.45 | 17.08 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.43 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.35 | 17.08 |
| Гомель — | 4.33 | 21.22 | 16.49 |
| Гродна — | 4.54 | 21.58 | 17.04 |
| Брэст — | 5.04 | 21.49 | 16.45 |

### Месяц

***Першая квадра 14 чэрвеня.***

***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

### Імяніны

***Пр.*** *Апалона, Дарафея, Ігара, Канстанціна, Леаніда, Нікандра, Фёдара.*
***К.*** *Альжбеты, Аманды, Паўлы, Марка, Марцэля.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Гутарацьдзве сяброўкі:
— Мой муж стаў сапраўдным дэспатам.
— У чым гэта выяўляецца?
— Раней ён патрабаваў кавы ў ложак, а цяпер — у гараж!

**— Варажбітка наваражыла, што ў наступным жыцці я буду казлом.**
**— Зацыкліла цябе ці што?**

У сям'і было цвёрдае правіла: адзін дзень па прадукты ходзіць муж, другі — жонка. Так і жылі: дзень пілі, дзень закусвалі.

**— Як цябе наогул зямля носіць?!**
**— Як упрыгожванне!**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, працп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.644. Індэкс 63850. Зак. № 1362.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 чэрвеня 2024 года.